УП. ФИНАНСОВ СОВ. СТРОИТЕЛЬСТВА И ПРАВА 1.12.36 Завед. 2.

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 66 (5440)
НЯДЗЕЛЯ
22
САКАВІКА
1936 г.
Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б — АБ ПРАВЕРЦЫ ГАТОЎНАСЦІ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ КАЛГАСАЎ, СОЎГАСАЎ І МТС.
ПРЫЁМ ДЭЛЕГАЦЫІ СОВЕЦКАЙ ГРУЗІІ КІРАЎНІКАМІ ПАРТЫІ І ЎРАДА Ў КРЭМЛІ.
ПРАМОВА ТАВ. В. М. МОЛАТАВА НА ПРЫЁМЕ ДЭЛЕГАЦЫІ СОВЕЦКАЙ ГРУЗІІ.
ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — ВАЖНЕЙШАЯ ЗАДАЧА ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ.
К. БЕНЕК — ЗАХАВАННЕ ПРЫПЛОДУ ЖЫВЕЛЫ—У ЦЭНТР УВАГІ.
МАЛЕНЬКІ ФЕЛЬЕТОН: **К. КРАПІВА** — ЯК КОМСАМОЛКА РАТНІКАВА ПРАЎДЫ ШУКАЛА.
С. ГАЛКІН — СТАЎКА НА ЗАНІЖАНЫЯ НОРМЫ.
ЗА РУБЯЖОМ:
ДЭКЛАРАЦЫЯ ФЛАНДЭНА ВА ФРАНЦУЗСКАЙ ПАЛАЦЕ ДЭПУТАТАЎ.
ПАСТАНОВА КАНФЕРЭНЦЫІ ДЭЯРЖАЎ — УДЗЕЛЬНІКАЎ ЛАКАРНСКАГА ДАГАВОРУ.
НОВЫЯ ДАНЫЯ АБ КАТАВАННЯХ СОВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН У ЯПОНА-МАНЧЖУРСКІХ ТУРМАХ.

Важнейшая задача партыйных арганізацый

Рашэнні трэцяга пленума Камісіі партыйнага кантроля пры ЦК ВКП(б) «Аб рабоце ўпаўнаважаных КПК» і «Аб рабоце парткалегіі КПК і парадку налажэння партыйных спагнанняў на членаў і кандыдатаў ВКП(б)», зацверджаныя ЦК ВКП(б), — маюць важнейшае палітычнае значэнне для ўсёй партыі. Гэтыя рашэнні астрыём сваім накіраваны на выхаванне комуністаў у духу найстражэйшага захавання статута партыі, разгортвання партыйнай дэмакратыі, павышэння большэвіцкай пільнасці і ўздыму арганізацыйна-партыйнай работы да ўзроўню палітычных задач.

У гэтых пастановах з усёй большэвіцкай праматой выкрыты буйнейшыя недахопы партыйнай работы, выкрыта чуждая большэвізму практыка асобных партарганізацый, ператварыўшая спагнанні «са сродку ўзмацнення партыйнай і дзяржаўнай дысцыпліны ў фармальна-бюракратычную меру». Гэтыя пастановы накіраваны на яшчэ большае ўзмацненне ўнутрыпартыйнай работы, на ўзняцце ролі і значэння первічных партыйных арганізацый, узняцце пачуцця адказнасці кожнага комуніста.

Метад пераканання — галоўны метад работы партыйных арганізацый. Трэба памятаць, што ў цэнтры партыйнай работы павінен быць комуніст. Асаблівая ўвага павінна быць аддана, як гэтаму заўсёды вучыць нас таварыш Сталін, любоўнаму, клапатліваму вырошчванню кадраў.

Партыйнае спагнанне з'яўляецца сродкам большэвіцкага выхавання комуніста. Аб гэтым павінна памятаць кожная первічная партыйная арганізацыя. Усебаковы і ўважлівы разгляд праступкаў членаў партыі на сходах первічных партыйных арганізацый выхоўвае ва ўсёй арганізацыі пачуццё адказнасці за паводзіны кожнага члена і кандыдата партыі, загартоўвае арганізацыю ў барацьбе за дасканалае выкананне статута нашай партыі — непарушнай асновы ўнутрыпартыйнага жыцця.

У часе праверкі партыйных дакументаў у КП(б)Б былі выкрыты факты, калі некаторыя первічныя партыйныя арганізацыі, ды нават і асобныя раённыя камітэты партыі замест большэвіцкага выхавання і выпраўлення памылак комуністаў адміністравалі, камандавалі, часта выносілі партыйныя спагнанні комуністу завочна і без патрэбы.

«Звязда» нядаўна пісала пра стыль работы Лельчыцкага райкома партыі, пра яго фармальна-бюракратычную практыку вынясення партыйных спагнанняў.

У часе праверкі партыйных дакументаў ЦК КП(б)Б выкрыў факты грубейшага скажэння прынцыпаў большэвізма на добрушскай фабрыцы «Герой працы». Былы сакратар парткома Малярэвіч груба зацісканы самакрытыку. За малейшыя, ненаўмысныя памылкі ён падвяргаў комуністаў да найстражэйшай партыйнай адказнасці (выключаў з партыі, выносіў шматлікія спагнанні). Іменна ў гэтай арганізацыі не бачылі яўных ворагаў партыі, якія былі выкрыты і выгнаны пасля выключэння з партыі гэтага-ж сакратара парткома, калі пры дапамозе ЦК КП(б)Б была разгорнута большэвіцкая самакрытыка і ўзнята палітычная роля кожнага комуніста.

Партыйнае спагнанне толькі тады можа з'явіцца магутным сродкам выхавання комуніста, калі кожны праступак будзе разглядацца не ў вузкім коле, а ў калектыве — на партыйным сходзе, калі ў ацэнцы гэтага праступку прыме ўдзел уся первічная партыйная арганізацыя.

У адносінах да комуністаў, якія зрабілі праступкі без злога намеру, партыйныя арганізацыі павінны ўжыць такія меры партыйнага спагнання і ўзмацнення дысцыпліны сярод членаў партыі, як цярплівае таварыскае растлумачэнне зробленай членам партыі памылкі, папярэджанне яго, вынясенне яму грамадскага ганьбавання і т. д.».

Аднак, было-б найвялікшай памылкай разумець пастановы пленума КПК, як амніставанне злачынстваў асобных членаў партыі. Задача бязлітаснай барацьбы з варожымі элементамі, якія ашуканчым шляхам прабраліся ў партыю, яшчэ з большай астрынёй паўстае зараз перад партыйнымі арганізацыямі.

Партыйная пільнасць патрабуе далейшага ўзмацнення партыйнай дысцыпліны, суровага захавання ленінска-сталінскага статута, далейшага паляпшэння арганізацыйна-партыйнай і выхаваўчай работы.

Роля первічных партыйных арганізацый — асновы партыі — нязмерна вырасла. Яны закліканы змагацца за правядзенне ў жыццё лозунгаў і дырэктыў партыі, нястомна ўзнімаць авангардную ролю комуніста, павышаць яго ідэйны ўзровень, па-сталінску выхоўваць і вырошчваць яго. Аднак, яшчэ сям-там ёсць такія кіраўнікі партыйных арганізацый, якія замест дапамогі комуністу гатовы занесці яго ў спіс пасіўных, што, безумоўна, лягчэй за ўсё. Такія факты мелі месца ў партыйнай арганізацыі фабрыкі «КІМ», «Профінтэрн» (Віцебск) і ў радзе іншых арганізацый.

Ведаць людзей, ведаць асаблівасці кожнага комуніста, уменць бачыць яго недахопы ў зародку і папярэджваць — адна з аснoўных задач первічнай партарганізацыі.

Асаблівай увагі ў пастанове пленума КПК заслугоўвае пытанне аб размежаванні партыйнага спагнання, якое ўскладаецца за парушэнне статута партыі, за парушэнне партыйнай дысцыпліны, ад спагнанняў, якія выносяцца комуністам за тыя ці іншыя парушэнні совецкіх законаў.

Пленум КПК рашуча асудзіў практыку, калі член або кандыдат партыі, выбыўшы механічна або выключаны з партыі за праступкі, якія не кампраметуюць яго, як беспартыйнага работніка совецкай краіны, тут-жа знімаецца з работы.

Нярэдкі прыклады, калі асобныя первічныя партыйныя арганізацыі лёгкадумна падыходзяць да разбору заяў, якія паступаюць на комуністаў.

Ясна, механічны падыход да жывых людзей з'яўляецца толькі рэзультатам паказной пільнасці, якая апрача шкоднасці нічога не дае. Большэвіцкая пільнасць азначае ўдумлівае, глыбокае вывучэнне праступкаў чалавека, уменне адрозніваць людзей, дапусціўшых памылкі, ад клясавых ворагаў.

У нашай краіне чалавек — самы каштоўны капітал, узняты на недасяжную вышыню. Гэта абавязвае ўсе партарганізацыі ўдасканаліць усе сродкі арганізацыі і выхавання найшырэйшых мас, у першую чаргу комуністаў, роля і значэнне якіх павялічваецца з кожным днём.

Праверка партыйных дакументаў ачысціла КП(б)Б ад класавых ворагаў, узмацніла, згуртавала яе рады. Абмен партыйных дакументаў павінен замацаваць рэзультаты праверкі і яшчэ вышэй узняць унутрыпартыйную работу.

Праводзячы ў жыццё рашэнні пленума КПК, КП(б) Беларусі яшчэ больш спэментуе свае рады вакол ЦК ВКП(б) і вялікага правадыра партыі таварыша Сталіна.

Прыём дэлегацыі Совецкай Грузіі кіраўнікамі партыі і ўрада ў Крэмлі

19 сакавіка ў Крэмлі, у сувязі з 15-годдзем устанаўлення совецкай улады ў Грузіі, адбыўся прыём дэлегацыі Грузіі кіраўнікамі партыі і ўрада.

Таварышоў **Сталіна, Молатава, Варашылава, Калініна, Орджанікідзе, Кагановіча, Мікояна, Андрэева, Чубара, Ежова, Якаўлева** 146 дэлегатаў рабочых, работніц, калгаснікаў, калгасніц, інжынераў, дасведчаных навукі і мастацтва, пілотаў, чырвонаармейцаў, камандзіраў, партыйных і совецкіх работнікаў ордэнаноснай Грузіі, стоячы, сустракаюць бясконцай авацыяй. Нясуцца прывітанні на рускай і грузінскай мовах: «Няхай жыве тав. Сталін, ура!», «Няхай жыве тав. Молатаў, тав. Варашылаў, тав. Орджанікідзе, тав. Кагановіч, ура!».

Нараду адкрыў старшыня народных камісараў СССР тав. **Молатаў**, якую вітаў прадстаўнікоў Грузіі з 15-годдзем устанаўлення совецкай улады ў Грузіі.

Нарада ператварылася ў агляд эканамічнага ўздыму Грузіі пасля ўстанаўлення совецкай улады, росквіту культуры Грузіі — нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зместу, у дэманстрацыю глыбокіх пачуццяў дружбы грузінскага народу да вялікага рускага народу. Прыём, які пачаўся ў 4 гадзіны, зацягнуўся да 2-х гадзін ночы.

Ні на мінуту не аслабявала напружанасць у зале, дзе кожная прамова гучала дэманстрацыяй адданасці працоўных Грузіі вялікай справе вызвалення чалавецтва. Не змаўкаючы грымелі прывітанні ў гонар партыі Леніна—Сталіна, у гонар правадыра працоўных усяго свету — таварыша Сталіна.

Пасля прамоў прадстаўнікоў Грузіі выступіў з яркай прамовай таварыш Молатаў, які паведаміў пад авацыю ўсёй залы аб тым, што **прэзідыум народы ўваходзіць у Цэнтральны Выканаўчы Камітэт СССР з хадайніцтвам аб узнагароджанні лепшых людзей Грузіі ордэнамі, а таксама аб тым, што ўрад узнагароджвае калгасы, прадстаўленыя дэлегацыяй, грузавікамі.**

У канцы нарады таварышы Сталін, Молатаў, Варашылаў, Орджанікідзе, Калінін, Кагановіч, Мікаян і Андрэеў уручылі членам дэлегацыі падарункі ўрада: галіннікі і патэфоны з пласцінкамі.

Кіраўнік грузінскіх і закаўказскіх большэвікоў тав. **Берыя Л. П.**, які ўзначальваў дэлегацыю і атрымаў падарунак апошнім, заклікаў кіраўнікоў партыі і ўрада і асабіста таварыша Сталіна ад імя працоўных Грузіі ў тым, што грузінскія большэвікі бяруць на сябе абавязацельства выправіць усе недахопы ў сваёй рабоце, каб выйсці ў далейшым з яшчэ лепшымі паказальнікамі, чым у гэтым годзе.

Заключныя словы тав. Берыя: **«Няхай жыве наш родны друг і настаўнік таварыш Сталін!»** падхватваюцца ўсёй дэлегацыяй спевам «Інтэрнацыянала».

ПРАМОВА тав. В. М. МОЛАТАВА

Анханагебо! **(Бурныя апладысменты, якія пераходзяць у авацыю).**

Таварышы! Кзб прыйсці да сённяшняга дня, калі пачаўся ўжо росквіт творчых сіл грузінскага народу, Грузія павінна была прайсці праз многія вякі сваёй гісторыі. У далёкае-далёкае мінулае ўходзіць гэта гісторыя, поўная цяжкіх пакут народу і яго гераічнай барацьбы за сваё шчасце, за сваё будучае.

Народ Грузіі перажыў многа вякоў прыгнечання ад знешніх падзявольнікаў, канчаючы царскай уладай Расіі. Калі ў далёкім мінулым знешнія набегі і прыгнечанне захватчыкаў не маглі зламаць волю грузінскага народу да самастойнасці і нацыянальнага развіцця, то праваліліся таксама і спроба гвалтоўнай русіфікацыі, якая праводзілася парызмам. Грузінскі народ перажыў нямала і ад прыгнятальнікаў сваёй краіны — ад памешчыкаў, захватаўшых лепшыя землі, і ад капіталістаў, мясповых царскіх чыноўнікаў.

Разам з тым Грузія ўпісала ў сваю гісторыю нямала слаўных старонак барацьбы народных мас супроць прыгнятальнікаў знешніх і ўнутраных. Рэвалюцыйныя сялянскія рухі супроць памешчыкаў-дваран ярка гавораць аб гэтым. Баявыя выступленні рабочых Тіфліса, Батума, Чыятур, Поці мелі нярэдка вялікае палітычнае значэнне для ўсёй Расіі, асабліва з таго перыяда, калі рабочы рух Закаўказля і перш за ўсё Тіфліса і Баку стаў пад сцяг рэвалюцыйнага марксізма, пад сцяг большэвікоў. Грузінскія большэвікі з самага пачатку гісторыі нашай партыі былі ў першых не радах і адыгралі выдатную ролю ў творчым развіцці большэвіцкіх ідэй і ў рэвалюцыйнай барацьбе супроць царскага самадзяржаўя, супроць памешчыкаў і капітала і далі нямала выдатных рэвалюцыйных дзеячоў не толькі для Грузіі і Закаўказля, але і для ўсёй нашай краіны.

Сапраўдная магчымасць для росту сіл, здольнасцей і талентаў стварылася ў нас толькі з часу перамогі рэвалюцыі, скінуўшай царызм. Трэба было, аднак, каб лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя 1917 года перарасла ў Кастрычніцкую пролетарскую рэвалюцыю, каб канчаткова забяспечыць свабоду развіцця і росквіт сіл народаў нашай краіны.

Але калі ў Расіі Кастрычніцкую рэвалюцыю аддзялялі ўсяго 8 месяцаў, то ў Грузіі мы мелі зусім іншае становішча. Тут мы мелі прыклад таго, як буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя не толькі не пайшла наперад, а, наадварот, пайшла назад дзякуючы зацягнуўшамуся панаванню меншавіцкай улады.

Тут, як і ў Расіі, меншавікі стаялі на грунце буржуазнай рэвалюцыі, але яны аказаліся няздольнымі ажыццявіць задачы нават гэтай рэвалюцыі. Яны аказаліся няздольнымі скарыстаць перамогу лютаўскай рэвалюцыі ў інтарэсах сапраўднага вызвалення народу. На працягу трох год панавалі грузінскія меншавікі, але сяляне так і асталіся без зямлі, а памешчыкі — на сваіх населеных мясцах. Рабочыя пры меншавіках так і асталіся ў рабстве ў капіталістаў, як было раней, да рэвалюцыі. Аб гаспадарчым і культурным уздыме Грузіі тады не магло быць і гутаркі. Грузія прыйшла к канцу панавання меншавікоў да гаспадарчай катастрофы і да культурнага заняпаду. Мала гэтага. Улада меншавікоў прывяла да таго, што ў Грузіі, як ніколі, гаспадарылі замежныя імперыялісты, спачатку нямецкія, затым англійскія і іх саюзнікі. Меншавіцкія кіраўнікі ператварыліся ў паслухмяную агентуру гэтых замежных імперыялістаў і пайшлі нават на заключэнне блоку з царскім генералам Дзенікіным. Толькі дапамога, якая прыйшла з боку Вялікай кастрычніцкай рэвалюцыі ў Расіі, памагла скінуць меншавікоў і пакончыць з кашмарным перыядам іх панавання ў Грузіі. Пачатак сапраўднага вызвалення і поўнага разняволення сіл грузінскага народу трэба лічыць з таго моманту, калі перамогшая пад кіраўніцтвам Леніна совецкая большэвіцкая рэвалюцыя, апіраючыся на рабочыя цэнтры нашай вялікай краіны і на рабоча-сялянскую Чырвоную армію, прышла ў 1920 годзе ў Закаўказле і затым пры ўсямерным садзейнасці тав. Сталіна аказала належную дапамогу грузінскаму народу і ўступіла ў Грузію пад непасрэдным кіраўніцтвам тав. Орджанікідзе. **(Апладысменты).**

З гэтага часу пачаўся няўхільны ўздым народнай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва ў Грузіі, пачаўся сапраўдны рост матэрыяльнага добрабыту рабочых і сялянскіх мас, пачалася сацыялістычная пераробка краіны. Усё, аб чым вы, таварышы, тут гаварылі, паведамляючы аб вашых дасягненнях у будаўніцтве сацыялізма, у галіне гаспадаркі і культуры, і многае іншае, аб чым вы не паспелі сказаць на гэтай нарадзе, сведчыць аб тым, што Грузія ідзе ў радах перадавых совецкіх рэспублік нашага Саюза. Совецкая ўлада ўзнагарадзіла Грузію і яе кіраўнікоў па заслугах ордэнам Леніна.

Мы можам сказаць, што ў Грузіі зроблена ўжо нямала, але гэта толькі пачатак, па якому толькі ў слабай меры можна меркаваць аб вялікім будаўніцтва сацыялізма ў нашай краіне. Грузія — гэта адзін з шчаслівейшых куткоў свету, насычаны прыроднымі багаццямі і, што асабліва важна, багаты людзьмі, талеты якіх блішчаць у Грузіі, у Закаўказзі і ва ўсім Совецкім Саюзе.

Грузінскі народ многае даў не толькі сваёй краіне, але і ўсяму Совецкаму Саюзу, які займае гаранаваё месца ў гісторыі чалавецтва. Даволі сказаць, што Грузія дала нам таварыша **СТАЛІНА. (Узрыў апладысментаў, доўга не змаўкаючая авацыя, прывітальныя воклічы ў гонар тав. Сталіна).**

Мы, большэвікі, ведаем, што значыць імя Сталіна для нашай партыі. Калі мы гаворым аб партыі, мы ніколі не забываем бясмертнага імя яе тварца—Леніна. Але цяпер, калі партыя пад кіраўніцтвам прадаўжальніка ленінскай справы, пад кіраўніцтвам тав. Сталіна разгарнула гігантыцкую барацьбу за вялікае будучае вызваленага ад капіталізма чалавецтва, мы гаворым аб партыі Леніна—Сталіна. **(Шумныя апладысменты, якія пераходзяць у авацыю. Крыкі «ўра»).**

Наш Совецкі Саюз паспяхова будуе сацыялізм. У вялікіх і малых работах па будаўніцтву сацыялізма ў нашай краіне — на кожным кроку мы бачым жалезную волю і большэвіцкае ідэйнае кіраўніцтва нашага Сталіна. **(Доўга не змаўкаючая авацыя. Прывітальныя воклічы ў гонар тав. Сталіна).**

Скажу, таварышы, аб нас саміх, аб кіруючых работніках. Больш за ўсё мы хочам аднаго — быць на справе вернымі саратнікамі і памочнікамі тав. Сталіна. **(Бурныя апладысменты).**

Дазвольце скончыць словамі прывітання працоўных Грузіі:

«Гаўмарджос сакартвелос мшромел халхс!» *) **(Бурныя апладысменты. Воклічы з месц: «Няхай жыве вялікі рускі народ, ура!», «Няхай жывуць кіраўнікі партыі і ўрада!», «Няхай жыве вялікая партыя Леніна—Сталіна!», «Няхай жыве вялікі сын грузінскага народу, правадыр народаў Совецкага Саюза Сталін!». Бурныя, доўга не змаўкаючая авацыя ў гонар тав. Сталіна. Дэлегаты пяюць «Інтэрнацыянал». Прывітальныя воклічы з месц).**

Таварышы, па даручэнню прэзідыума данай нарады я павінен вам перадаць аб тым, што мы, члены прэзідыума, уваходзім у Цэнтральны Выканаўчы Камітэт з прапановай аб узнагароджанні дэлегатаў Грузіі вышэйшай узнагародай Совецкага Саюза — ордэнамі. **(Бурныя апладысменты).**

Просім таварышоў дэлегатаў прыняць зараз невялікія падарункі ад урада: кожнаму дэлегату і дэлегатцы — галіннік і патэфон з пласцінкамі, а кожнаму прадстаўленаму тут калгасу будзе дадзены грузавы аўтамабіль.

(Доўгая авацыя. Воклічы: «Няхай жыве совецкі ўрад!». Крыкі «ўра»).

*) «Няхай жывуць працоўныя Грузіі!»

Аб правеоцы гатоўнасці да веснавой сяўбы калгасаў, соўгасаў і МТС

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

Бюро ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Правесці з 22 сакавіка па 2 красавіка 1936 г. праверку гатоўнасці кожнага калгаса, соўгаса і МТС да веснавой сяўбы. Ў задачы праверкі паставіць: выяўленне і поўную ліквідацыю ўсіх недахопаў у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы (поўнасцю закончыць абмен і ачыстку насення, рамонт сельскагаспадарчага інвентару і машын, вывазку гною, торфу, палрыхтоўку пягавай сілы, арганізацыю брыгад, звеньняў і замацаванне за імі ўчасткаў, забеспячэнне МТС гаручым і т. д.) з тым, каб к пачатку сяўбы выйсці без адзінага адстаючага калгаса, соўгаса і МТС.

Да ўдзелу ў праверцы неабходна прыцягнуць шырокія масы калгаснікаў і калгасніц, а таксама рабочых соўгасаў і МТС і ў першую чаргу калгасны і соўгасны актыў, ордэнаноснаў, лепшых ударнікаў і ўдарніц, арганізуючы ўсю работу пад знакам разгортвання барацьбы за большэвіцкае правядзенне першай стаханаўскай вясны.

2. ЦК КП(б)Б абавязвае акругкомы, райкомы і кожную первічную партарганізацыю ў ходзе праверкі падрыхтоўкі да вясны шырока растлумачыць кожнаму калгаснику і рабочаму соўгаса і МТС значэнне ўзятых на сябе Беларускай ССР абавязацельстваў па заключаных дагаварах на соцспаборніцтва з Чарнігаўскай і Кіеўскай абласнямі за пяршынства ў барацьбе за ўраджай і шырока арганізаваць заключэнне дагавароў на соцспаборніцтва за хутчэйшую і якасна высокую сяўбу як паміж асобнымі МТС, калгасамі і соўгасамі, так і ўнутры іх.

3. ЦК КП(б)Б лічыць неабходным на час праверкі выезд у найбольш адстаючыя раёны членаў бюро ЦК і членаў ЦК КП(б)Б тт. Чарвякова, Картукова, Бенека, Саакяна, Старніна, Кавальчука, Кудзелька і Кузьміна.

Для лепшай арганізацыі работы па праверцы падрыхтоўкі да сяўбы на месцах і дапамогі раёнам даручыць сельгасаддзелу ЦК КП(б)Б мабілізаваць з цэнтральнага партактыва 80 чалавек, накіраваўшы іх у адстаючыя раёны.

4. Абавязаць сакратароў АК і РК КП(б)Б, старшынь акрвыканкомаў і РВК накіраваць на час праверкі гатоўнасці да сяўбы ўвесь акруговы і раённы партыйны і совецкі актыў у калгасы, соўгасы і сельсоветы.

5. Абавязаць рэдактароў цэнтральных і раённых газет асвятляць на старонках друку ход правядзення дэкадніка па праверцы гатоўнасці да сяўбы ў МТС, калгасах і соўгасах.

6. Інструкцыйную нараду з пасылаемымі ў раёны работнікамі даручыць правесці тт. Картукову і Бенеку.

Дэкларацыя Фландэна ва французскай палаце дэпутатаў

ПАРЫЖ, 20 сакавіка. (БЕЛТА). Сёння ў палаце дэпутатаў з дэкларацыяй выступіў французскі міністр замежных спраў Фландэн, які вярнуўся з Лондана. Адзначыўшы, што Совет Лігі нацый устанавіў парушэнне не Германіяй версальскага і локарнскага дагавораў, Фландэн заявіў: «Французскі ўрад жадаў, каб міжнародныя законы былі поўнасцю адноўлены шляхам звароту да становішча, якое існавала ў Рэйнскай зоне да 7 сакавіка. Без сумнення, гэты рэзультат мог-бы быць дасягнут, калі-б астатнія ўдзельнікі Локарно былі згодны аказаць на Берлін энергічнае ўздзеянне».

«Каб апраўдаць свой аднабаковы акт, — гаварыў далей Фландэн, — Германія спаслалася на меркаванні юрыдычнага характару. Лагічна, значыць, што цяпер Германія будзе запрошана далажыць гэтыя меркаванні перад міжнародным гаагскім трыбуналам».

Фландэн затым прыйшоў змест пагадненняў локарнскіх дзяржаў. Фландэн пры гэтым указаў, што міжнародная камісія, якая павінна наглядаць за выкананнем абавязацельстваў, якія змяшчаюцца ў гэтым пагадненні, дае Францыі новыя гарантыі, якіх яна не мела раней у адносінах дэмілітарызаванай Рэйнскай вобласці.

«У поўнай згодзе з бельгійскай дэлегацыяй французская дэлегацыя настойвала, каб цяпер-жа былі заключаны пагадненні, якія-б забяспечвалі магчымасць дрымяненне ваенных гарантый, без якіх узаемная дапамога можа спазніцца ў выпадку агрэсіі. Англійскі ўрад далучыўся да гэтай прапановы. Я спадзяюся, што палата ацэніць важнасць гэтага рашэння. Яно адзначае рашучы этап у пасляваенных франка-англійскіх адносінах».

«На выпадак, калі Германія адмовіцца ад зробленых ёй прапаноў,— заявіў міністр замежных спраў, — якія складаюць адзінае цэлае, нашы ўрады прынялі ўжо рашэнне прымяніць сумесныя меры, якія яны прызнаюць неабходнымі».

Палата, якая ў часе выступлення Фландэна неаднаразова прарывала яго апладысментамі, у канцы наладзіла яму авацыю.

Пастанова канферэнцыі дэяржаў—удзельнікаў лакарнскага дагавору

ЛОНДАН, 20 сакавіка. (БЕЛТА). Сёння вечарам апублікавана «Белая кніга» аб рашэннях, прынятых дзяржавамі — удзельніцамі Лакарно — Бельгіяй, Францыяй, Англіяй і Італіяй у сувязі з разрывам Германіяй лакарнскага дагавору і ўводам германскіх войск у Рэйнскую зону.

У першых трох пунктах рашэння гаворыцца: паколькі істотнай умовай захавання міру з'яўляецца дасканалае выкананне ўсятых дагаворных абавязацельстваў, Германія, парушыўшы 43 арт. версальскага дагавору, а таксама лакарнскі дагавор, зрабіла аднабаковае дзеянне, якое ўносіць новы элемент непакою ў міжнароднае становішча і стварае патрозу безапаснасці ў Еўропе.

Ніякая акалічнасць, меўшая месца да ці з моманту парушэння лакарнскага дагавору, не можа вызваліць дзяржавы, падпісаўшыя гэты дагавор, ад якіх-небудзь прынятых імі на сябе абавязацельстваў ці гарантый і апошнія палкам астаюцца ў сіле. Таму чатыры дзяржавы неадкладна даручаюць сваім генеральным штабам увайсці ва ўзаемны кантакт для таго, каб дагаварыцца аб тэхнічных умовах ажыццяўлення абавязацельстваў, якія ляжаць на гэтых краінах у выпадку нявыклікнай агрэсіі.

У пункце 4-м рашэння ўказваецца, што чатыры дзяржавы прынялі рашэнне звярнуцца да германскага ўрада з прапановай прадставіць у міжнародны гаагскі трыбунал аргументы, у сілу якіх германскі ўрад лічыць, што франка-совецкі дагавор аб узаемнай дапамозе несумяшчальны з лакарнскім дагаворам; пры гэтым германскі ўрад павінен абавязацца прызнаць рашэнні гэтага трыбунала канчатковымі. Французскі ўрад заяўляе, што ён ужо згадзіўся, каб гэта пытанне было перадана ў гаагскі міжнародны трыбунал.

Пункт 5-ты гаворыць аб тым, што прадстаўнікі чатырох дзяржаў прынялі рашэнне ад імя сваіх урадаў сумесна прапанаваць германскаму ўраду далучыцца да наступнага часовага пагаднення.

1. Пасылка ўсякіх войск і сыравіны ў зону, якая вызначана арт. 42 версальскага дагавору, неадкладна будзе прыпынена.

2. Поўваенныя арганізацыі (штурмавікі, ахоўныя атрады, працоўны корпус і інш. арганізацыі), размешчаныя ў той-жа зоне, павінны мець такую-ж колькасць, як і да 7-га сакавіка 1936 г., у прыватнасці гэтыя арганізацыі ні ў якім выпадку не павінны быць аведзены ў буйныя злучэнні, або выкарыстаны простыя ці ўскосна для падмацавання войск.

3. Ва ўказанай зоне не павінны быць прадпрыняты якія-небудзь работы па стварэнню ўмацаванняў, а таксама работы па палепшэнню, ці стварэнню пасадачных плацовак. Урады Францыі і Бельгіі роўным чынам абавязваюцца прыпыніць на працягу гэтага перыяда ўсякую адпраўку войск у зону, якая прылягае да іх граніц з Германіяй.

У пункце 6-м указваецца, што чатыры дзяржавы прынялі рашэнне:

1. Стварыць міжнародныя войскі, уключаючы атрады з армій дзяржаў-гарантаў. Гэтыя войскі павінны быць размешчаны са згоды ўсіх зацікаўленых урадаў, у зоне, якая знаходзіцца паміж бельгійска-германскай і франка-германскай границамі — з аднаго боку, і лініяй, якая праходзіць на ўсход ад указаных граніц на адлегласці, прыкладна, у 20 клм. Гэта зона павінна быць палкам занята ўказанымі міжнароднымі войскамі.

2. Стварыць міжнародную камісію для нагляду за выкананнем усіх абавязацельстваў, прынятых на сябе дзяржавамі, стварыўшымі вышэйуказаныя войскі.

Пункт 7 устанаўлівае, што калі германскі ўрад прыме накіраваны яму зварот, то ён будзе запрошан прыняць удзел у перагаворах, якія прадугледжваюць:

1. Разгляд прапаноў, якія змяшчаюцца ў мемарандуме германскага ўрада ад 7 сакавіка (за выключэннем пытання аб звароце ў Лігу нацый).

2. Перагляд статута Рэйнскай вобласці.

3. Выпрацоўка пакту аб узаемнай дапамозе, адкрытага для далучэння да яго ўсіх удзельнікаў Лакарно.

Што датычыць чатырох дзяржаў, прадстаўленых у Лондане, то ў матах умацавання іх безапаснасці будуць прадугледжаны асобныя абавязацельствы аб узаемнай дапамозе.

У апошніх пунктах рашэння гаворыцца, што 4 дзяржавы падтрымліваюць прапанову аб скліканні міжнароднай канферэнцыі, якая разгледзела-б пытанні аб заключэнні пагаднення для арганізацыі сістэмы калектыўнай безапаснасці і забеспячэння эфектыўнага абмежавання ўзбраенняў, праблемы эканамічных адносін і арганізацыі гандлю паміж краінамі і прапановы, зробленыя германскім урадам у яго мемарандуме ад 7 сакавіка.

Гутарка т. Молатава з п. ШАСТЭНЭ

19 сакавіка 1936 г. старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР тав. МОЛАТАЎ прыняў галоўнага рэдактара французскай газеты «Тан» п. Шастэнэ.

Тэатр народнай творчасці

У Маскве адкрыт тэатр народнай творчасці, прадназначаны для дэманстрацыі ўсіх відаў мастацкай самадзейнасці рабочых, калгаснікаў, чырвонаармейцаў і іх дзяцей. На сцэне новага тэатра будуць выступаць самадзейныя калектывы рэспублік, абласцей і раёнаў Саюза. Мастацкім кіраўніком тэатра прызначан тав. Охлопкоў.

ПРЫЁМ ТАВ. КАЛІНІНЫМ ДЭЛЕГАЦЫІ ІЛЬНАВОДАЎ КАЛІНІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

МАСКВА, 20 сакавіка. (БЕЛТА). Старшыня ЦВК Саюза ССР М. І. Калінін прыняў 20 сакавіка ў Крэмлі дэлегацыю ільнаводаў Калінінскай вобласці, якая прымала ўдзел у нарадзе перадавікоў ільнаводства і канопляводства пры Цэнтральным Камітэце ВКП(б).

Майстры большэвіцкіх ураджаяў, узнагароджаныя ордэнамі Совецкага Саюза, у сяброўскай гутарцы расказалі ўсесаюзнаму старасце аб сваіх дасягненнях, жыцці і рабоце калгасаў, аб сваіх планах на будучае.

Тав. Калінін падрабязна распытваў дэлегатаў аб розных дэталях калгаснага жыцця і вытворчасці. Гутарка цягнулася каля 3 гадзін.

Французскі друк аб лонданскіх рашэннях

ПАРЫЖ, 20 сакавіка. (БЕЛТА). Французскі друк выказвае задавальненне рэзультатамі прынятых у Лондане рашэнняў. Газеты падкрэсліваюць, як значны поспех французскай палітыкі, а разам з тым і сістэмы калектыўнай безапаснасці, аднагалоснае рашэнне Совета Лігі нацый, якое канстатуе парушэнне Германіяй лакарнскага дагавору.

Разам з тым друк, праўда, з вельмі значнымі агаворкамі, вітае пагадненне лакарнскіх дзяржаў. Усе газеты падкрэсліваюць, што адзіным практычным рэзультатам гэтага пагаднення з'яўляецца рашэнне аб ваеннай узаемадапамозе паміж Англіяй, Францыяй і Бельгіяй. Астатнія рэзультаты маюць пераважна маральны характар.

Перш за ўсё, як падкрэсліваюць усе газеты, план лакарнскіх дзяржаў будзе, мабыць, апрацінут катэгарычным адмаўленнем Германіі перадаць франка-совецкі дагавор на абмеркаванне гаагскага трыбунала і, падругое, яе нежаданнем згадзіцца на заняцце 20-кілометравай прасторы Рэйнскай вобласці міжнароднымі войскамі. Паводле слоў газет, у колах германскай дэлегацыі ў Лондане ўжо ўчора заяўлялі, што Германія ніколі не згодзіцца на прыняцце гэтых прапаноў.

АБМЕН ПАРТЫЙНЫХ ДАКУМЕНТАЎ

БЕЗАДКАЗНАСЦЬ У АФАРМЛЕННІ ПАРТЫЙНЫХ ДАКУМЕНТАЎ

ЦК ВКП(б) устанавіў суровы парадак у афармленні партыйных дакументаў, высылцы выпіскі з актаў па праверцы партыйных дакументаў, учотных картак на членаў і кандыдатаў партыі пераязджаючых з адной у другую арганізацыю.

Аднак, асобныя сакратары райкомаў труба парушаюць дырэктыву ЦК ВКП(б) аб навядзенні ідэальнага парадку ў партыйнай гаспадарцы.

Штодзенна ў менскую сталічную партыйную арганізацыю прыязджаюць дзесяткі членаў і кандыдатаў партыі, аднак пры ўзяцці іх на ўчот менскія райкомы адчуваюць вялікія затрудненні, бо некаторыя сакратары райкомаў месяцамі не высылаюць партыйных дакументаў (учотных картак, выпіскі з актаў аб праверцы партыйных дакументаў). Дастаткова сказаць, што толькі аднаму Варашылаўскаму райкому не прысланы выпіскі з актаў аб праверцы партыйных дакументаў на 157 членаў і кандыдатаў партыі.

Вось ужо некалькі месяцаў як гомельскі гарком не прысылае партыйных дакументаў на члена партыі т. **Шэйнай**, аршанскі палітаддзел чыгункі на т. **Карташова**. Месяцамі не высылае полацкі райком акта праверкі на т. **Маслоўскага**.

Па віне райкомаў члены і кандыдаты партыі адрываюцца ад партыйнага жыцця, бо без учотнай карткі і выпіскі з акта аб праверцы партыйных дакументаў райкомы не бяруць на ўчот.

Асобныя сакратары райкомаў па-ранейшаму лёгкадумна адносяцца да афармлення партыйных дакументаў, перадаваяючь гэту «тэхнічную» работу другарадным работнікам.

Віцебскі гарком і магілеўскі райком пасылаюць выпіскі з актаў праверкі партыйных дакументаў не па ўстаноўленай форме, як гэта патрабуе ЦК ВКП(б), на маленькіх кавалках паперы. Аршанскі райком устанавіў «уласныя формы» афармлення партыйных дакументаў, абмяжоўваючыся толькі паведамленнем, што такі-то таварыш прайшоў праверку партыйных дакументаў. Амаль таксама паступае і заслаўскі райком. Бешанковіцкі райком умудрыўся нават прыслаць акт праверкі партыйных дакументаў на т. Фалькевіча з дапушчанымі памылкамі ў партыйным стажы. Буда-Кашалеўскі райком высылае многія выпіскі з актаў па праверцы партыйных дакументаў не за подпісам першага сакратара райкома, як гэтага патрабуе ЦК ВКП(б), а за подпісам тэхнічнага работніка.

Выпіскі з актаў праверкі партыйных дакументаў ёсць адзін з асноўных дакументаў пры выдачы новага партыйнага білета і лёгкалумныя адносіны некаторых сакратароў райкомаў да афармлення партыйных дакументаў прыносяць вялікую шкоду.

Час спыніць безадказнасць да афармлення партыйных дакументаў. Указанне ЦК ВКП(б) павінна быць выканана дакладна і безагаворачна.

ХТО НЕ АТРЫМАЎ ПАРТБІЛЕТА

Ужо некалькі дзён у Сталінскім райкоме партыі праходзіць абмен партыйных дакументаў. Яшчэ раз сакратар райкома тав. **Літвін** падрабязна гутарыць з кожным комуністам, выяўляе, наколькі кожны апраўдвае высокае званне члена партыі.

Пытанне аб тых, хто не спраўляецца з абавязкамі члена партыі і не можа атрымаць партыйнага білета, разглядаецца на бюро райкома.

Перад бюро райкома т. **Баскін**, член партыі з 1930 года. Палітычны ўзровень яго вусім нізкі. Ён малаграматны. Асабліва дрэнна разбіраецца ў пытаннях бягучай палітыкі. Баскін прызнаўся, што ён яшчэ не падрыхтаваны выконваць патрабаванні, якія прад'яўляюцца члену партыі. Баскін працуе столярам Аўтарэмснаба. На вытворчасці ён служыць прыкладам для многіх. У апошні час пачаў лепш вучыцца. Бюро райкома пастанавіла перавесці т. Баскіна з членаў у кандыдаты партыі.

— Я пастараюся падрыхтаваць сябе ў члены партыі, — заявіў Баскін. Гэтымі словамі было выказана жаданне пролетарыя быць у перадавых радах людзей свайго класа.

Вось **Бладыка**, член партыі з 1931 года. Бладыка добрасумленна выконвае работу санітаркі першай совецкай больніцы. Ад палітычнага жыцця яна адстала. Яшчэ ў 1933 годзе гарадская кантрольная камісія вынесла ёй партыйнае спагнанне за гніла-ліберальныя адносіны да ворагаў партыі. Бладыка з гэтага не вынесла ўроку. І да гэтага часу яна была вусім пасіўнай. За 5 год прабывання ў партыі Бладыка нічым сябе не правяла. Партыйным жыццём не цікавілася. Дрэнна разбіраецца ў пытаннях бягучай палітыкі.

І бюро райкома пастанавіла не выдаць Бладыка партыйнага білета, як пасіўнай, як «баласту» ў партыі.

Рашэнне бюро тут-жа паведамляецца кожнаму з выкліканых, растлумачваецца, чаму вынесена рашэнне аб пераводзе ў кандыдаты, спачуваючыя, або чым выкліканы рашэнне аб пазбаўленні высокага звання члена партыі.

* * *

У партыйнай арганізацыі Сталінскага раёна шырока разгарнулася падрыхтоўка да абмену партыйных дакументаў. Але ёсць арганізацыі, якія не зразумелі ўсёй палітычнай сутнасці абмену. Партыйная арганізацыя Дома партактыва, якая ў асноўным складаецца з палітычна падрыхтаваных комуністаў, замест сур'ёзных пытанняў па ўзьдыму партыйнай работы занялася выдачай характарыстык на кожнага комуніста.

Партыйная арганізацыя завода «Чырвоная зорка» парашыла ў тарміновым парадку заслухаць справаздачы ўсіх комуністаў. І для гэтага быў прысвечан спецыяльны партыйны сход.

Ц. ФРЫД.

17 сакавіка ў Растове на-Дану на Тэатральнай плошчы адбыўся парад, прысвечаны совецкаму казацтву. У парадзе прымалі ўдзел калгаснікі-казакі — донцы, кубанцы, терцы і джыгіты Паўночнага Каўказа, чырвонаармейцы і ўзброеныя асоавіяхімаўцы. Парад прымаў маршал Совецкага Саюза Семён Міхайлавіч Будзённы.

Пасля параду адбылася масавая дэманстрацыя працоўных горада Растова.

На здымку: бацькі-зверскі замучанага белымі бандамі легендарнага героя грамадзянскай вайны казака Міхаіла Крывашлыкава — Васілій Іванавіч і Марыя Ігнацьеўна і іх унучка Ніна на парадзе.

Фото Дружэлюбава і Браталюбава (Саюзфото).

ЗВЫЧАЙНЫЯ СПРАВЫ

— Я рабочы торфзавода «Чырвоная Беларусь», Быхаўскага раёна. Па працягу двух год пакутую ад язвы голені. Ніхто з медыцынскіх работнікаў ні ў раёне, ні на заводзе не мог аказаць мне дапамогі.

Гутарка ідзе, значыць, аб нячулых, няўважлівых адносінах да чалавека.

— Толькі страшныя пакуты, якія я да гэтага часу перанёс, прымусілі мяне даверыць хворую нагу фельчару нашага пункта Дамброўскаму. Ён нядаўна прыехаў на завод.

Справа станавілася больш ясная. Аказваўся вядомым канкрэтны носьбіт зла, відавочны вінаўнік далейшых пакут хворага.

Але рантам аказваецца, што меркаванне гэта няправільнае. Далейшая гісторыя рабочага торфазавода Брылькова—гэта выдатная гісторыя аб цёплай увазе да чалавека, аб сардэчнай дапамозе яму.

Тры тыдні тав. Дамброўскі лячыў нагу Брылькова. Кожны дзень ён рабіў перавязкі, ванны, прыкладаў кампрэсы. Ён аддаў гэтай справе столькі ўвагі і стараннасці, праявіў столькі ўмення, што намаганні яго ўвянчаліся поўным поспехам.

— Цяпер я здароў, — радасна піша Брылькоў, — і спяшаюся праз газету падзякаваць тав. Дамброўскага.

Дзесяць гадоў хварэў П. І. Чартовіч на хранічнае запаленне правай галені. Некаторыя ўрачы і нават прафесары прапанавалі ўжо зрабіць яму ампутацыю ногі, але хворага ўзяў пад свой нагляд праф Александр Ефімавіч Мангейм. Чартовіч цяпер здароў.

Маленькі, як быццам нязначны выпадак. 7-гадовы хлопчык, які знаходзіўся на лячэнні ў вушным аддзяленні 1-й менскай гарадской больніцы, раптам захварэў на іншую ўнутраную хваробу. Неадкладна быў выклікан урач-тэрапеўт, які аказаў дзіцяці неабходную дапамогу. Урач аддаялення Цепліц на працягу гадзіны наведала хворага не менш 10 раз. Хворыя, якіх лечыць т. Цепліц, у захапленні ад яе чуласці і клапатлівасці да людзей, горача дзякуюць яе за адданую выдатную работу.

Работа медыцынскага персанала ў такой лекавай установе, як псіхіятрычная, вельмі складаная. Труднасць абстаноўкі, нервовая напружанасць, велізарная адказнасць робяць такую работу ў пэўным сэнсе гэтага слова гераічнай. Глыбокую падзяку выказваюць былыя хворыя персаналу псіхіятрычнага аддзялення 2-й менскай гарадской больніцы, у прыватнасці ўрачу С. Е. Брук і медыцынскім сёстрам Вайсман і Віткоўскай.

Ды ці толькі тут мы сустракаемся з уважлівымі, клапатлівымі работнікамі, для якіх клопаты аб людзях — удзячная справа, якую яны робяць скромна і без рысоўкі, не чакаючы за гэта ні падзякі, ні ўзнагароды. Дырэктар соўгаса «Беларусь» комуніст т. Турчын праяўляе літаральна бацькаўскія клопаты аб былых выхаванцах Сёмкава-гарадзецкай комуны імя Чарвякова Ганчарове, Дзядзюлі і Зіневічу, якія працуюць у соўгасе. Гарачыя словы падзякі заслугоўвае за сваю адданую работу настаўніца Ольга Канстанцінаўна Крывашэева ад сваіх вучняў 20-й менскай вячэрняй школы для дарослых.

Усе гэтыя людзі — скромныя звычайныя людзі, якіх у нашай краіне сотні тысяч і мільёны. Але іх справы, аб якіх мы расказалі, —выдатны і ўзвышаны расказ аб совецкім гуманізме, аб бескарыслівай клапатлівасці, аб самаадданай барацьбе за жыццё і здароўе людзей, якія не прыходзяцца ім ні прыяцелямі, ні сваякамі. Толькі ў нашай цудоўнай краіне сацыялізма такія справы з'яўляюцца звычайнымі пры ўсёй сваёй велічы.

МІХАЙЛАЎ.

ЧЭХАЎСКІЯ РЭПЕТЫТАРЫ

Чэхаўскі рэпетытар быў вельмі ўсхваляваны. Шосты раз задае свайму вучню чапвертае скланенне, а ён «ні ў зуб нагой». Неўзабаве прышоў бацька вучня. Надумаў рэпетытар праэкзаменаваць Пепю пры бацьку: «няхай дурны бацька ведае, які дурны яго сын». Але здарылася зусім іншае. Дурным аказаўся рэпетытар. Ён не мог рашыць самай простай арыфметычнай задачкі...

Каморнік **Масанін**, «нейкім цудам» атрымаўшы пост дырэктара пятай слушкай няпоўнай сярэдняй школы, **прызначыў** сябе выкладчыкам гісторыі і геаграфіі. Ён вучыў дзяцей таму, што Ірландыя належыць Амерыцы, што рака Лена выцякае з Байкала. Пры «выкладанні» гісторыі ён засмечваў галовы вучняў усякімі шкоднымі, контррэволюцыйнымі фармулёўкамі і цверджаннямі.

Настаўніца ўзаравіцкай узорнай поўнай сярэдняй школы, апавядаючы дзецям пра тундру, гаварыла: «Тундру насяляюць эскімосы і славуты».

Што за народнасць «славуты»? Заглянуўшы ў падручнік, знаходзім: Тундру насяляюць эскімосы. Славуты спадарожнік, наведаўшы эскімосаў...».

Ёсць і такія настаўнікі, якія не чытаюць мастацкай літаратуры. У санюкоўскай няпоўнай сярэдняй школе, Ельскага раёна, настаўніца **Модзіна** паэму Якуба Коласа «Новая зямля» прыпісала... А. Александровічу. Яму-ж тав. **Плескачэўскі** прыпісаў паэму Янкі Купала «Над ракою Арэсай».

Вось некаторыя вынікі праведзенай дыктоўкі сярод настаўнікаў. Настаўнік **Жэлезка С.** (будзянская школа, Хойніцкага раёна) на 150 слоў зрабіў 119 памылак. Настаўнік **В. Лешчаня** (Глускі раён) у невялічкай дыктоўцы зрабіў 33 памылкі. Настаўнік **Талаш** (Капаткевіцкі раён) зрабіў 54 памылкі. І не дзіўна, калі такія выкладчыкі, выпраўляючы вучнёўскія пісьмовыя работы, прапускаюць, а часамі, папраўляючы вучняў, самі дапускаюць граматычныя памылкі.

І. ЕСЬМАН.

ХОД АЦЁЛАЎ, АПАРОСАЎ, АКОТАЎ І ЗАХАВАННЕ МАЛАДНЯКА

па жывёлагадоўчых таварных фермах БССР на 1 сакав на 1936 г.

НАЗВА РАЁНАЎ	МТФ (у проц.) Ацёлілася кароў.	МТФ (у проц.) Загінула і прырэзана маладняка.	СТФ (у проц.) Апарасілася свіноматак.	СТФ (у проц.) Загінула і прырэзана парасят.	АТФ (у проц.) Акацілася авечак.	АТФ (у проц.) Загінула і прырэзана ягнят.
1. Аршанскі	37,3	5,3	8,9	14,2	48,0	4,1
2. Асвейскі	9,7	2,5	7,4	6,6	40,5	5,4
3. Багушэўскі	31,2	7,2	3,6	16,6	44,4	4,7
4. Бешанковіцкі	28,4	0,9	0,8	4,4	9,1	3,1
5. Ветрынскі	27,9	5,6	9,2	3,1	57,7	4,3
6. Віцебскі	29,7	8,5	12,5	16,0	48,6	6,9
7. Гарадоцкі	41,0	5,4	11,8	16,3	51,4	6,4
8. Горацкі	27,7	4,0	6,9	19,5	35,2	8,8
9. Дрысенскі	6,5	2,0	2,3	—	24,2	—
10. Дрыбінскі	9,5	1,9	0,9	—	21,0	2,0
11. Дубровенскі	—	—	—	—	—	—
12. Касцюковіцкі	36,6	6,1	12,8	4,1	62,0	3,1
13. Клімавіцкі	38,4	5,6	10,1	19,3	67,1	2,6
14. Круглянскі	17,5	—	21,2	3,1	6,3	3,9
15. Крычаўскі	32,3	12,9	8,6	12,7	38,7	4,5
16. Лепельскі	8,4	4,6	5,0	14,5	24,2	0,8
17. Лёзнянскі	9,1	3,9	4,4	10,1	22,0	6,6
18. Магілеўскі	—	—	—	—	—	—
19. Мехаўскі	34,0	7,9	14,1	12,9	51,8	5,3
20. Мсціслаўскі	11,4	2,0	1,5	2,9	25,8	1,8
21. Полацкі	28,9	5,0	26,0	4,9	59,7	4,9
22. Расонскі	27,9	4,5	22,6	11,2	48,0	3,2
23. Сенненскі	10,5	3,0	4,1	32,7	18,0	4,2
24. Сіроцінскі	33,8	8,0	17,4	11,4	42,6	8,1
25. Суражскі	28,5	5,8	7,1	20,2	23,0	7,6
26. Талачынскі	27,7	3,5	8,5	13,8	33,4	5,7
27. Ушацкі	24,0	2,0	14,5	11,7	39,7	2,3
28. Халопеніцкі	51,4	4,5	21,9	17,7	40,8	4,2
29. Хоцімскі	39,7	5,3	8,2	18,7	61,6	2,8
30. Чашніцкі	—	—	—	—	—	—
31. Чавускі	24,9	4,7	9,8	13,9	44,1	3,1
32. Шклоўскі	35,9	5,4	6,0	13,8	81,2	3,9
33. Асіпавіцкі	37,9	0,8	5,3	4,5	28,8	0,6
34. Бабруйскі	43,2	5,9	20,6	18,5	51,1	3,3
35. Барысаўскі	32,6	6,3	10,7	3,9	27,6	2,1
36. Б.-Кашалеўскі	42,1	5,4	16,4	14,9	64,3	4,1
37. Бялыніцкі	15,8	1,4	6,1	13,0	28,7	0,5
38. Бярэзінскі	12,1	2,3	3,6	—	27,4	—
39. Быхаўскі	9,1	4,5	3,7	23,6	27,1	1,6
40. Веткаўскі	37,6	4,9	20,8	4,1	71,1	4,2
41. Гомельскі	35,9	8,9	11,1	12,7	51,0	2,5
42. Добрушскі	16,5	3,2	8,6	7,6	29,7	—
43. Журавіцкі	—	—	—	—	—	—
44. Жлобінскі	33,2	6,9	12,5	8,0	52,6	8,4
45. Кармянскі	32,4	4,7	9,8	22,0	34,4	5,8
46. Клічаўскі	33,5	10,9	17,1	17,8	60,1	4,7
47. Кіраўскі	10,7	2,8	1,8	6,8	33,2	—
48. Крупскі	51,3	2,9	13,5	5,1	36,8	3,2
49. Менскі	28,4	5,3	8,3	17,7	56,8	5,4
50. Прапойскі	23,6	1,8	3,0	1,3	32,4	1,7
51. Пухавіцкі	26,9	3,9	8,7	15,8	48,3	3,8
52. Рагачоўскі	11,0	1,7	10,3	3,8	21,4	0,9
53. Рудзенскі	39,9	3,1	20,2	18,0	36,4	1,8
54. Рэчыцкі	—	—	—	—	—	—
55. Свяцілавіцкі	—	—	—	—	—	—
56. Смалявіцкі	14,5	2,9	4,8	11,4	20,6	1,4
57. Церахаўскі	19,6	2,8	2,9	11,3	34,5	—
58. Уваравіцкі	—	—	—	—	—	—
59. Чачэрскі	35,5	8,3	5,8	17,5	55,2	6,4
60. Чэрвеньскі	33,7	4,8	23,2	14,2	46,7	4,3
61. Чырвонапольскі	35,9	5,1	7,9	8,9	39,5	3,6
62. Чэрыкаўскі	50,4	4,9	14,1	12,3	71,5	2,2
63. Бягомльскі	31,3	3,1	6,0	10,1	50,7	2,2
64. Брагінскі	36,3	3,6	19,8	7,8	62,2	7,0
65. Глускі	10,5	1,0	2,8	8,2	44,5	1,5
66. Грэскі	8,6	4,6	3,4	19,4	19,9	—
67. Даяржынскі	31,2	4,9	6,8	6,6	35,1	5,5
68. Даманавіцкі	31,5	3,0	12,6	15,1	43,9	1,7
69. Ельскі	—	—	—	—	—	—
70. Жыткавіцкі	27,8	7,3	10,5	16,4	54,5	6,8
71. Зэлаўскі	29,6	7,2	8,6	14,3	60,9	2,9
72. Капыльскі	32,7	8,9	13,5	15,6	23,1	6,0
73. Камарынскі	29,0	2,6	14,2	16,1	64,1	2,1
74. Капаткевіцкі	25,8	4,5	13,2	4,8	24,5	—
75. Лагойскі	38,5	7,5	14,4	14,3	49,4	3,5
76. Лельчыцкі	—	—	—	—	—	—
77. Лоеўскі	37,2	7,6	16,9	11,6	59,8	3,0
78. Любаньскі	35,4	7,1	14,4	4,9	54,0	3,9
79. Мазырскі	19,3	2,2	5,6	6,9	16,8	0,9
80. Нараўлянскі	35,5	6,4	14,1	9,0	48,2	1,7
81. Плешчаніцкі	44,1	4,7	20,2	14,1	52,9	2,9
82. Парыцкі	33,1	7,7	14,7	8,1	63,1	3,4
83. Петрыкоўскі	—	—	—	—	—	—
84. Слуцкі	12,6	2,3	3,3	23,8	20,0	1,4
85. Старадарожскі	—	—	—	—	—	—
86. Старобінскі	23,1	6,5	6,8	56,6	40,5	5,6
87. Тураўскі	31,1	2,5	21,9	3,6	60,2	—
88. Уздзенскі	35,9	9,2	7,5	9,4	35,4	—
89. Хойніцкі	7,2	1,8	4,4	12,8	22,4	—
90. Чырвонаслабодскі	18,2	6,5	4,1	7,3	19,1	4,2
Усяго па БССР:	24,3	5,2	8,0	12,4	35,8	3,6

ЗАХАВАННЕ ПРЫПЛОДУ ЖЫВЕЛЫ—У ЦЭНТР УВАГІ

К. БЕНЕК

Беларуская ССР, як і ўвесь Совецкі Саюз, у 1935 г. дабілася вялікіх поспехаў у барацьбе за ажыццяўленне задач, пастаўленых партыяй і асабіста таварышам **Сталіным** у галіне жывёлагадоўлі.

У 1935 г. пагалоўе коней павялічылася на 0,9 проц., колькасць буйнай рагатай жывёлы вырасла на 23,7 проц., свіней—на 35,2 проц. і авец — на 12,1 проц., прычым найбольшы прырост далі групы маладняка: колькасць цялят у параўнанні з 1934 г. павялічылася на 72,2 проц., парасят — на 25,7 проц., ягнят — на 23,8 проц. і жарабят — на 155,2 проц. Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што аднаўленне пагалоўя ў рэспубліцы пасля рэарганізацыйнага перыяда стала на цвёрды шлях магутнага ўздыму.

Прайшоўшы год даў нам прырост жывёлы ў асабістым карыстанні калгаснікаў. За адзін толькі 1935 г. бескароўным калгаснікам перадана 41 200 цёлак у парадку дапамогі ў набыцці кароў у асабістае карыстанне. Колькасць свіней у асабістым карыстанні калгаснікаў вырасла за 1935 г. на 472 тыс. і авец — на 127,3 тыс. Значна расце колькасць птушкі. Рад раёнаў, правільна выконваючы сталінскі статут сельгасарцелі, клапоцяцца аб асабістай жывёлагадоўлі калгаснага двара. У цэлым-жа па рэспубліцы справа з ліквідацыяй бескароўнасці стаіць нездавальняюча.

Адзначаючы кораткa гэтыя першыя дасягненні ў галіне развіцця жывёлагадоўлі, мы ў даным артыкуле маем на ўвазе сканцэнтраваць увагу органаў Наркамзема на мясных ветэрынарна-зоатэхнічных спецыялістаў, шырокіх мас калгаснікаў і партыйна-совецкага кіраўніцтва раёнаў на тых абурываючых недахопах, якія да гэтага часу яшчэ ёсць у рабоце на жывёлагадоўлі ў значнай частцы раёнаў і калгасаў. Калі гэтыя недахопы не будуць знішчаны неадкладна, яны могуць затармазіць далейшае развіццё жывёлагадоўлі і знізіць значнае дасягнутых поспехаў.

Перш за ўсё аб выніках 1935 г. у сувязі з дзяржаўным планам развіцця жывёлагадоўлі.

Па рэспубліцы план па буйнай рагатай жывёле як у калгасах, так і па калгасна-сялянскаму сектару ў цэлым перавыканан. Аднак 10 раёнаў — Ветрынскі, Віцебскі, Магілеўскі, Полацкі, Жлобінскі, Кіраўскі, Свяцілавіцкі, Глускі, Грэскі і Петрыкаўскі — план вырошчвання цялят у 1935 г. не выканалі.

План па вырошчванню свіней па рэспубліцы таксама перавыканан, але 28 раёнамі план вырошчвання свіней не выканан.

Значна горш стаіць справа з выкананнем плана па коцях і авечках. Дзяржаўны план вырошчвання жарабят не выканан ні адным раёнам, а план вырошчвання ягнят выканаў толькі Чашніцкі раён.

Сотні перадавых ферм і работнікаў жывёлагадоўлі дабіліся поўнай ліквідацыі ялавасці матак і адыходу маладняка. Сярод іх мы маем такіх герояў-ордэнаносцаў, як коней ордэнаносец **Батоўкін Нікіта Ермалаевіч**, які забяспечыў стопроцантную выжарабку кабыл і поўнае захаванне жарабят; як **Зайцаў Філіп Савельевіч**, вырасціўшы па 25 парасят на кожную свіноматку; як **Канстанцінава Анна Андрэеўна**, вырасціўшая за 10 год 1.669 цялят без адзінага выпадку адыходу; як **Ганус Юстын Аляксеевіч**, вырасціўшы 230 ягнят ад 100 аўпаматак, і сотні да іх падобных.

Аднак большасць ферм яшчэ працуе дрэнна. У рэзультаце ў 1935 г. страчаны па калгасах сотні тысяч галоў прыплоду, а ў радзе раёнаў загінула ад адной чвэрткі да трэці прыплоду: Любаньскі — 25,8 проц. усяго прыплоду парасят, Камарынскі—25,7 проц., Заслаўскі—27,4 проц., Жыткавіцкі — 28,4 проц., Даяржынскі —31,9 проц., Грэскі — 25,6 проц., Менскі — 26,3 проц., Кіраўскі — 25,3 проц., Барысаўскі—31,6 проц., Полацкі — 25,4 проц. і рад іншых.

Такое становішча абавязвала раённыя зямельныя органы, іх спецыялістаў, партыйнае і совецкае кіраўніцтва з асаблівай старанасцю падрыхтаваць фермы да ацёлаў, апаросаў і акотаў гэтага года, поўнасцю і ў тэрмін правесці ўсе мерапрыемствы, указаныя ЦК КП(б)Б і СНК БССР па падрыхтоўцы да зімовага ўтрымання жывёлы да канца выкарыстаць вопыт перадавікоў жывёлагадоўлі, усляжна падтрымліваючы і развіваючы стаханаўскі рух на фермах з тым, каб у 1936 г. пакончыць з такой агіднай з'явай, як гібель велізарнай колькасці маладняка.

На жаль, вопыт работы першых месяцаў гаворыць аб адваротным. Кіраўнікі многіх раёнаў не жадаюць, відавочна, рабіць належных практычных і палітычных вывадаў з вынікаў мінулага года. Балбочучы аб стаханаўскім руху, яны і далей апартуністычна адносяцца да кіраўніцтва жывёлагадоўляй, міраюцца з адыходам і разбазарваннем прыплоду, лічачы, як відаць, невыкананне даяржаўных планаў па жывёлагадоўлі, вялікія страты маладняка і пастаянныя адставанні асаблівасцю асобных раёнаў.

Вось некалькі прыкладаў:

Дзяржынскі раён у мінулым годзе плана вырошчвання свіней не выканаў, адыход парасят на фермах быў рэкордны—31,9 проц. У бягучым годзе толькі за 2 месяцы загінула 300 свіней і прырэзана 134, у той час, як нарадзілася толькі 439. У раёне ўсе спакойны. Тт. **Вансоўскі** і **Дамброўскі**, як відаць, лічаць такое становішча нармальным. Маўчыць загадчык райземаддзела т. **Курганскі**, маўчыць і звыш 10 чалавек зоаветспецыялістаў, у тым ліку старшы зоатэхнік **Леўчэня** і старшы ветурач **Грыбштэйн**. Відавочна, гэты агідны адыход лічыцца імі нармальным і кіраўніцтва раёна гэта не турбуе.

Пухавіцкі раён таксама ў мінулым годзе плана вырошчвання свіней не выканаў. У бягучым годзе за 2 месяцы атрымаў 378 парасят, а загінула і прырэзана 384. Ці ведаюць аб гэтым кіраўнікі раёна і, перш за ўсё, загадчык райземаддзела т. **Думанісса** сваімі зоаветспецыялістамі і што яны практычна робяць? Па нашых даных нічога.

Кіраўскі раён у мінулым годзе не выканаў даяржаўнага плана ні па адному віду жывёлагадоўлі. У гэтым годзе цялят рэжуць і разбазараюць (за два месяцы загатоўлена каля 600 цялячых скур), у радзе ферм звыш паловы цялят загінула ад няправільнай выпайкі і дагляду (у калгасе «Ільіч» з нарадзіўшыхся 20 цялят загінула 12). У раёне таксама не адчуваецца асаблівых турбот. У мінулым годзе работнікі Кіраўскага раёна схільны былі растлумачыць агідныя вынікі работы па жывёлагадоўлі тым, што ў перыяд масавых ацёлаў, апаросаў, акотаў раён толькі арганізаваўся. А ў бягучым годзе якія могуць быць апраўданні?

У першыя-ж месяцы дапушчаны агідны адыход і разбазаранне маладняка, створана прамая пагроза зрыву даяржаўнага плана жывёлагадоўлі.

Лепшыя людзі па жывёлагадоўлі Беларускай ССР, удзельнікі нарады жывёлаводаў-перадавікоў, у тым ліку 39 ордэнаноснцаў, дабіліся выключна вялікіх поспехаў у справе жывёлагадоўлі. Яны далі высокія паказальнікі прадукцыйнасці, поўнасцю ліквідавалі ялавасць матак і адыход маладняка. На ўсебеларускай нарадзе перадавікоў жывёлагадоўлі многія з іх падзяліліся сваім вопытам з усёй масай калгаснікаў.

На гэтай-жа нарадзе перадавікі жывёлагадоўлі прынялі, дагавор па сацыялістычнаму спаборніцтву з Заходняй вобласцю, у якім яны зварачаюцца з заклікам да ўсіх калгаснікаў і рабочых соўгасаў Беларускай ССР і Заходняй вобласці аб тым, каб пры безумоўным выкананні даяржаўнага плана па жывёлагадоўлі развіць пэўсюдную магутную хвалю стаханаўскага руху за тону прыплоду на свінаматку, за 3.000 літраў малака на карову, за 150—200 ягнят ад 100 аўпаматак, за вырошчванне не менш 90 жарабят ад 100 кабыл.

Няма сумнення ў тым, што 755 перадавікоў жывёлагадоўлі, якія галасавалі за гэты дагавор, не толькі самі з гонарам выканаюць узятыя абавязацельствы, але і павядуць за сабою дзесяткі тысяч работнікаў ферм, якія яшчэ не з'яўляюцца перадавікамі.

Сотні ферм выдатна арганізавалі вырошчванне прыплоду. Нават у названых вышэй раёнах, дзе вырошчванне маладняка пастаўлена выключна дрэнна, рад ферм не маюць ніякага адыходу. Сярод іх — ферма буйнай рагатай жывёлы калгаса імя Дзяржынскага Клічаўскага раёна (заг. фермы т. Філенчык), ферма калгаса «Сеяліста», Кіраўскага раёна (заг. фермай т. Альтэўскі) і т. д.

Але гэтым людзям трэба дапамагчы, іх вопыт трэба перанесці на ўсе астатнія калгасы. Гэта патрабуе вялікай арганізацыйна-масавай работы, штодзённага аператыўнага кіраўніцтва справай жывёлагадоўлі з боку райземаддзела і глыбокага ведання сапраўднага становішча справы ў кожным асобным калгасе.

Ва многіх раёнах не разумеюць гэтага, думаючы, што забяспечыць магутны ўздым жывёлагадоўлі і павышэнне прадукцыйнасці жывёлы можна вынясеннем час-ад-часу тых ці іншых пастаноў, не кантралюючы да таго-ж іх выканання.

Лепш, карысней для справы сацыялістычнай жывёлагадоўлі — добра, да драбнейшых падрабязнасцей праверыць калгасную ферму, чым сядзець і прыдумваць фармулёўкі чарговай пастановы ці загада ў «раённым маштабе».

Час ужо з гэтай недапушчальнай з'явай пакончыць. Час ужо совецкім і партыйным арганізацыям, райземаддзелаў і зоаветспецыялістам па-сапраўднаму, па-гэтай галіне.

Не кампанейскімі наскокамі, не рывкамі, а штодзённай упартай, крапатлівай работай толькі і можна ажыццявіць задачы 1936 сталінаўскага года ў галіне жывёлагадоўлі. Не можа быць цярпіма больш такое становішча, як гібель велізарнай колькасці маладняка.

Трэба неадкладна даць дакладны аналіз прычын падзяжу на кожнай ферме, неадкладна знішчыць гэтыя прычыны, рашуча павысіўшы ролю і адказнасць спецыялістаў, зоаветработнікаў за захаванне прыплоду. Трэба на справе ажыццявіць пэлажэнне аб зоаспецыялістах, каб асноўны свой рабочы час яны былі непасрэдна на ферме асабліва ў час масавых ацёлаў, выжарабак, апаросаў, акотаў.

Райвыканкомы абавязаны паўсюдна ў дакладнасці выканаць пастанову ўрада аб стварэнні матэрыяльна-вытворчых і бытавых умоў спецыялістам (кватэра, транспарт). Неабходна актывізаваць сельсоветы і жывёлагадоўчыя сходы пры іх у барацьбе за захаванне прыплоду і добрае ўтрымане жывёлы. Шматлікія матэрыялы гавораць, што органы пролетарскай дыктатуры на вёсцы нерэдкі часта стаяць у баку ці вядуць агульныя размовы, не ведаючы, што робіцца з маладняком па сельсавету.

На фермах, якія панеслі страты маладняка, трэба неадкладна прыняць меры да атрымання дадатковага прыплоду звыш плана (ушчыльненыя апаросы, акоты, купля і т. д.). Трэба ўстанавіць найстражэйшы кантроль за рухам маладняка ў калгаснікаў і адзіначасобнікаў, дапамагчы калгаснікам у хутчэйшым набыцці жывёлы у адпаведнасці з калгасным статутам, растлумачыць антыдаяржаўную сутнасць убою маладняка.

Улічваючы вельмі дадатны вопыт лагернага ўтрымання свіней у мінулым годзе ў справе ліквідацыі ачагоў захворвання ў радзе соўгасаў і ферм, неабходна зараз-жа рыхтавацца да таго, каб з наступленнем пагалоўе было цяпла ўсё свінае асаблівa трэба ў лагерах. Гэта раёнам, як Дзяржынскі, Капыльскі, Слуцкі, Даяржынскі, Капыльскі, якія з горысаўскі і рад інвысокі процант да ў год даюць прыплоду звыш плана.

Кожны раён адыходу парасят поўнасцю захаваць павінен дабіцца выкарыстаць вопыт маладняка, мабілізаваць усіх перадавікоў, прапоўных аднаго калгаснікаў і нае захаванне прыплоду на поўнай ферме, выканаць план вырошчвання і перавыканаць 1936 стаханаўскага года і бесумоўна забяспечыць

ЗАСТАЎСЯ БЕЗ КВАТЭРЫ

(Пісьмо ў рэдакцыю)

У маі 1935 года я тэрмінова быў выклікан у Маскву. Праз месяц вярнуўся ў Менск. За час маёй адсутнасці старшыня жакта № 23 Свірноўскі перадаў маю кватэру (Ракаўская вул., д. 26 кв. 11) другому. Я падаў скаргу ў суд. Жыллямера прысудзіла ў месячны тэрмін прадаставіць мне кватэру.

Ужо мінула некалькі месяцаў, а Свірноўскі пастановы не выконаў. Ён адсекуецца а мяне, пенсіянера, праслужыўшага 20 год картаўніком на чыгунцы (я і цяпер працую, хоць маю 74 гады, але вось прытулку, дзе можна было-б адпачыць, не маю).

Умяшаўся і пракурор г. Менска, Гінзбург, але і ён да канца не давёў справу. Прашу рэдакцыю прыняць тэрміновыя меры.

А. Ф. ПАДАБЕД.

ОЧКАЎЦІРАЦЕЛЬСТВА

(Пісьмо служачага)

У час хлебазакупак па Барысаўскаму раёну некаторыя хлебныя склады авансам выпісвалі квітанцыі за быццам-бы праданае збожжа. Так, калгасы Чарневіцкага сельсовета маюць квітанцыі на 10 тон зярна, якое яны яшчэ не здавалі. Калгасы «Кастрычнік», «Чырвоная Слабодка» і некаторыя аднаасобнікі замест зярна «прадавалі»... грошы і атрымлівалі квітанцыі «за зданае зярно».

У выніку такой «работы» на складзе ў Забашэвічах больш квітанцый, чым хлеба.

МАХНАЧ.

ЗАНЯПАЛА КУЛЬТУРНАЯ РАБОТА

(Пісьмо работніка раённай газеты)

Увосень мінулага года Міхеевіцкі дом сацкультуры (Крычаўскі раён) быў сапраўды ачагом культуры. Працавалі рознастайныя гурткі, ставіліся спектаклі, праводзіліся голасныя чыткі газет. Здавалася, што ў далейшым культурна-масавая работа павінна была-б яшчэ больш разгарнуцца. Але атрымалася інакш.

Старшыня сельсовета Рэпіловіч спыніў адпускаць сродкі, асігнаваныя на патрэбы Дома сацкультуры. Работа заглохла. Зараз у Доме сацкультуры няма нават газет.

Палітінспектар раёна т. Максіменка гэтага не бачыць. Таксама не бачыць ён, што ў Баеўскім і Маляціцкім сельсоветах дамы сацкультуры не забяспечаны дровамі, загадчыкі гэтых дамоў выконваюць розныя даручэнні старшынь сельсоветаў, а сваёй непасрэднай работай не займаюцца.

А. КАЗІМІРАЎ.

ШКОЛА ПА-ЗА ЎВАГАЙ

(Пісьмо настаўнікаў)

Памяшканне Бялевіцкай няпоўнай сярэдняй школы (Чырвонаслабодскі раён) зусім не прыстасавана да заняткаў. Школа працуе ў дзве змены. Між тым, другі будынак школы райвыканком перадаў пад амбулаторыю. Апрача таго, школа не забяспечана дровамі. Гэта ніколькі не турбуе ні сельсовет, ні райана.

БУРАНКОЎ, ДОМАШ і інш.

(Усяго 8 подпісаў).

ПА МАТЭРЫЯЛАХ „ЗВЯЗДЫ"

«ПРЫШЫБЕЕВЫ Ў РОЛІ НАСТАЎНІКАЎ»

Пад гэтым загалоўкам у «Звяздзе» ад 3 сакавіка быў змешчан артыкул аб дрэнным выхаванні і абыходжанні з дзецьмі ў дзямяноўскім дзіцячым доме, Добрушскага раёна.

Абгаварыўшы матэрыял, бюро РК КП(б)Б канстатуе, што ўсе факты, адзначаныя ў карэспандэнцыі, далкам пацвердзіліся. З боку раённага аддзела народнай асветы, а таксама і райкома комсамола не было штодзённага кіраўніцтва, кантролю і дапамогі ў рабоце дзіцячага дома. Загадчык райана т. Бельчыкаў выключна ядзбайна, фармальна і бюракратычна падышоў да падбору выхаваўчаў, у выніку чаго на работу ў дзіцячы дом былі пасланы прахадзімцы, якія не маюць нічога агульнага са справай выхаваўчай работы.

Бюро РК абавязала райком комсамола і асабіста сакратара т. Пакроўскага сістэматычна аказваць дапамогу ў выхаванні дзяцей дзіцячага дома.

Тав. Бельчыкаву ўказана на фармальна-бюракратычны падыход да кіраўніцтва дзіцячым домам і прапанавана асабіста правяраць склад выхаваўцаў, умацаваць дзіцячы дом праверанымі маючымі педагагічныя навыкі людзьмі.

Пракурору раёна т. Ліўшыцу даручана зараз-жа расследаваць усе факты злоўжыванняў і вінаватых прыцягнуць да крымінальнай адказнасці.

НАРАДА ПЕРАДАВІКОЎ ПА ІЛЬНУ І КАНОПЛЯХ З КІРАЎНІКАМІ ПАРТЫІ І УРАДА

Прамова тав. САВЕЛЬЕВАЙ Аляксандры Іванаўны

ТЭХНАРУК КАМЕНСКАГА ІЛЬНОЗАВОДА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Таварышы, ад імя беларускай делегацыі перадавікоў ільнаводства, ад рабочых, работніц і інжынерна-тэхнічнага персаналу ільнозаводаў Лепельскага раёна дазвольце перадаць гарачае, палкае прывітанне кіраўнікам партыі і ўрада на чале з нашым дарагім, блізкім і любімым усім таварышам Сталіным! **(Апладысменты).** Таксама дазвольце перадаць прывітанне нашаму ленінскаму комсамолу, працуючаму пад кіраўніцтвам таварыща Косарэва! **(Апладысменты).** Яшчэ хачу перадаць палкае прывітанне ўсім перадавікам ільнаводства, якія сядзяць тут, у гэтай зале! **(Апладысменты).**

Таварышы, цяпер некалькі слоў аб сваёй рабоце, а таксама аб некаторых момантах свайго жыцця.

Сямігодку я скончыла ў 1928 годзе. З прычыны цяжкіх матэрыяльных умоў я пашла працаваць на фабрыку, вярней, на завод «Раснол» у якасці старшай работніцы сушыльнага і мачыльнага цэха. Прапрацавала я 1 год, і мяне камандыравалі вучыцца ў горад Белы, у тэхнікум, на тэхналагічнае аддзяленне. Скончыла я тэхнікум замест 4 год за 3 гады. Па сканчэнню тэхнікума нас, перадавых комсамольцаў, у колькасці 20 чалавек, паслалі працаваць у Беларусь, у Менскі ільнотрэст у якасці тэхнарукаў. У пачатку 1933 года якраз у Менскім ільнотрэсце было штодзённа па радзе ільнозаводаў. У сувязі з гэтым выбралі самых праверaных, вытрыманых і стойкіх комсамольцаў і паслалі ў Беларусь. І там мне далі Лепельскі ільнозавод. Там я прапрацавала год. Спачатку я сустракалася з вялікімі труднасцямі. Заводы былі дрэнна абсталяваны ва ўсіх адносінах — і ў адносінах машын і ў адносінах усіх умоў работы. Працаваць было цяжка, але труднасці, якія сустракаліся на маім шляху, я перамагала. У сучасны момант заводы Лепельскага раёна працуюць лепш, чым у мінулы час, план выконваецца і перавыконваецца.

У 1934 годзе мяне, па распараджэнню ільнотрэста, перавялі на Каменскі ільнозавод, дзе я працую і зараз. Якасць прадукцыі гэтага завода была нядрэнная. Процант выхаду доўгага валакна складаў 9 супроць 6 планавых. Так-жа сама мы давалі кудзелі з турбінных адыходаў 70 проц. супроць планавых 30. У 1935 годзе наш завод быў прэміраван аўтамашынай. Былі прэміраваны таксама работніцы. Работнік-ударнік у нас 50 чалавек. Пры дапамозе ўдарнікаў і пры дапамозе іх энтузіязму мы выконвалі і перавыконвалі план.

У верасні мінулага года турбіна «ЛТ-2» у нас перароблена па праекту т. Тіханава. Трэба выказаць вялікую падзяку т. Тіханаву за тое, што ён перакансструяваў нам турбіну і тым самым павысіў процант выхаду доўгага валакна. Замест 7—8 процантаў выхаду доўгага валакна мы цяпер даем 15—16 процантаў.

На перакансструяванай машыне я пачала працаваць з 15 студзеня 1936 года. З перапрацаванай трасты сярэднім нумарам 1,4 мы давалі 13,8 проц. выхаду доўгага валакна, а ў стахановскую дэкаду мы далі да 16 проц. выхаду доўгага валакна з трасты нумарам 1,5 Гэты вопыт стахановскай дэкады абяцаю праводзіць як пастаянны метад работы. Якасць кудзелі ў нас у сучасны момант нядрэнная, адсартыроўка турбінных адыходаў даходзіць да 80 проц. супроць 50 проц. планавых.

Стахановцаў у нас 25 чалавек. Стахановскі рух вырас у нас пасля прамовы таварыша Сталіна. Стахановскі рух ахапляе нашы ільнозаводы, і я спадзяюся, што ў нас да канца сезона будзе не 25 чалавек стахановцаў, а ўсе 100 проц. рабочых будуць стахановцамі. **(Апладысменты).**

Таварышы, як бачыце, ленінскі комсамол нядрэнна змагаецца і з'яўляецца нядрэнным застрэльшчыкам у стахановскім руху. Калі ўзяць нашу беларускую делегацыю, то ў ёй 10 жанчын, з іх 6 комсамолак. **(Апладысменты).** Гэтыя 6 чалавек маюць нядрэнныя паказальнікі. Тут і ільнотрапальшчыцы, якія даюць па 120 кілограмаў за 10-гадзінны рабочы дзень, тут і ільнацерабільшчыцы, якія выперабілі па 90 гектараў ільну за сезон, тут ёсць звеннявыя, якія далі дзяржаве звыш 3,5 цэнтнераў валакна з гектара.

Няхай жыве комуністычная партыя на чале з нашым любімым, дарагім правадыром таварышам Сталіным! **(Апладысменты).**

Няхай жыве ленінскі комсамол на чале з т. Косарэвым! **(Апладысменты).**

Няхай жывуць перадавікі ільнаводства! **(Апладысменты).**

Прамова тав. КАРАВОСАВАЙ Домны Сцяпанаўны

ІЛЬНОЦЕРАБІЛЬШЧЫЦА ГОРАЦКАЙ МТС, БЕЛАРУСКАЙ ССР

Таварышы, дазвольце ад беларускай делегацыі перадаць гарачае прывітанне партыі і ўраду і нашаму вялікаму правадыру таварышу Сталіну! **(Апладысменты).**

Я хачу расказаць аб сваёй рабоце.

Я працавала на машыне «ВНИИЛ-5». Я скончыла двухмесячныя курсы. Першы час я баялася машыны, мне яна здавалася страшнай. Калі калгаснікі ў першы раз убачылі гэту машыну, яна ім таксама не спадабалася.

Потым я адрэгулявала машыну. Калгаснікі ўбачылі, што машына можа працаваць, і яна ім спадабалася. Ездзіла я з гэтай машынай з калгаса ў калгас.

Я берагла машыну больш, чым самую сябе. Сама пра сябе так не думала, як пра сваю машыну. **(Апладысменты).** Я яе змазвала, своечасова рэгулявала, абпіралз, сачыла, каб не было паломкі. Я выпрацавала на гэтай машыне 86 гектараў. Тут некаторыя гаварылі, што яны выпрацавалі па 122 гектары. Я не ведаю, чаму ў мяне так атрымалася, але я змагла выпрацаваць толькі 86 гектараў.

Там, дзе аралі трактары, там, вядома, машына брала добра, а там, дзе аралі цягавай сілай, там многа баразён і працаваць там горш. Калі бывае дождж, барозны размываюць, і машына не можа брацъ.

На вялікіх плошчах, калі яны добра апрацаваны трактарамі, працаваць, вядома, значна лепш.

На 1936 год я бяру на сябе абавязацельства выперабіць 100 гектараў. **(Апладысменты).**

Няхай жыве комуністычная партыя!

Няхай жыве наш правадыр Сталін! **(Працяглыя апладысменты).**

СТАЎКА НА ЗАНІЖАНЫЯ НОРМЫ

(На галіннай канферэнцыі цагельна-чарапічнай прамысловасці БССР)

У сваім дакладзе на першым пасяджэнні канферэнцыі дырэктар трэста будматэрыялаў т. Бампі папракаў заводы ў імкненні занізіць тэхнічныя нормы. Сапраўды, некаторыя кіраўнікі заводаў дапусцілі грубейшыя скажэнні пры праектаванні новых норм магутнасцей абсталявання. Яны не ўразумелі розніцу паміж тэхнічнымі нормамі магутнасцей і нормамі выпрацоўкі, не ўлічылі, што пры распрацоўцы тэхнічных норм трэба выходзіць з вышэйшых дасягненняў стахановцаў, а не з сярэдніх паказальнікаў, як гэта робіцца пры ўстанаўленні норм выпрацоўкі.

Стахановская практыка абвергла ўсе існаваўшыя дагэтуль «тэхнічна ўгрунтаваныя» нормы на цагельных і чарапічных заводах. Рэкорды стахановцаў Кубашова, Сіняковіча. Талейка і дзесяткаў іншых герояў соцыялістычнай прадукцыйнасці працы паказалі, якія велізарныя рэзервы хаваюцца ў прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. Цагельны завод № 1 (Менск) у стахановскую змену выпусціў на бабруйскім двухмунштучным прэсе «Сведала» 48 тыс. цаглін-сырцу. Цагельны завод № 3 на адмунштучным прэсе «Келера» даў за змену 46 тыс. цаглін-сырцу.

Не гледзячы на гэта завод № 1 (дырэктар т. **Богін**, тэхнікіраўнік т. **Круцько**) упарта настойваў на запвярджэнні тэхнічных норм магутнасці бабруйскага прэса ў 27 тыс. цаглін-сырцу. Цагельны завод № 3 (дырэктар т. **Міркін**, тэхнікіраўнік т. **Місуноў**) запраектаваў новую норму магутнасці прэса «Келера»—у 36 тыс. цаглін-сырцу.

Дырэктар Віцебскага цагельнага завода № 5 Пружынін заведама занізіў магутнасць сушыльнай гаспадаркі. Ён прадставіў на запвярджэнне норму прапускной здольнасці стыляжоў—6,5 абаротаў за сезон, замест сапраўды магчымых 12 абаротаў.

На чарапічным заводзе № 2 (дырэктар т. **Асінскі**) запраектавалі новую норму магутнасці печы ў 90 тыс. шт чарапіцы ў месяц. Заніжаная норма! Праведзеная стахановская пяцідзёўка паказала, што печ можа даць за месяц не 90 тыс., а 160 тыс. штук чарапіцы. Цяпер т. Асінскі, не гледзячы на рэзультаты стахановскай пяцідзёўкі, настойвае ўсё-ж на запвярджэнні магутнасці печы ў 140 тыс. штук.

Ці выпадковы ўсе гэтыя факты? Ці выпадковы спробы кіраўнікоў некаторых заводаў ва што-б там ні стала «дабіцца» ад канферэнцыі ўстанаўлення як можна меншых норм? Безумоўна, не. Яны выцякаюць з адносін самога трэста да гэтага пытання. Трэст па сутнасці стаіць на той-жа пазіцыі, што і ўказаныя заводы.

З чым прышоў трэст будматэрыялаў на галінную канферэнцыю?

Удзельнікам канферэнцыі разданы праект рэзалюцыі па перагляду тэхнічных норм магутнасцей абсталявання. У гэтай рэзалюцыі трэст будматэрыялаў прапануе прыняць тэхнічную норму магутнасці бабруйскага прэса «Сведала» ў 4.500 цаглін-сырцу за гадзіну або 36 тыс. шт. за змену.

Чаму 36 тысяч, калі прэс ужо даў 48 тыс шт. за змену? Ці не ясна, што трэст няправільна арыентуе канферэнцыю, прапануе ёй зацвердзіць заведама нізкія нормы магутнасці. Па прэсу «Келера» трэст запраектаваў магутнасць у 32 тыс. шт., у той час калі гэта «норма» ўжо даўно перакрыта стахановцамі і калі завод № 3 сам праектаваў 36.000 штук.

Тое самае і з пячной гаспадаркай. Тав. Бампі паведамляе ўдзельнікам канферэнцыі, што цагельныя заводы Маскоўскай, Днепрапетроўскай і іншых абласцей здымаюць з аднаго кубічнага метра гофманскай печы 1.240 цэглы. Гэта аднак не перашкаджае трэсту будматэрыялаў прапанаваць канферэнцыі зацвердзіць магутнасць тых-жа гофманскіх пячэй у 1.150 шт. з кубаметра.

Чарапічныя заводы № 1 (Віцебск) і № 2 (Менск) па салазачных прэсах «Егера» дасягнулі прадукцыйнасці ў 5 тыс. шт. чарапіцы за змену. А трэст будматэрыялаў прапануе зацвердзіць магутнасць печы «Егера» ў 4 тыс. шт.

Які вывад трэба зрабіць? Трэст, як і некаторыя кіраўнікі цагельных і чарапічных заводаў, пашоў па лініі арыентацыі на сярэднія паказальнікі стахановцаў пры ўстанаўленні норм магутнасцей. Лінія яўна няправільная!

С. ГАЛКІН.

Без уліку дасягненняў стахановцаў

Закончыла сваю работу галінная канферэнцыя тарфяной прамысловасці. Прыходзіцца зноў адзначыць, што кіраўніцтва Белторфа паўтарыла памылку, дапушчаную іншымі трэстамі (швейны, металатрэст), аб чым пісала ўжо «Звязда».

Дырэктары торфзаводаў прыехалі на канферэнцыю непадрыхтаванымі. Пытанне вытворчай магутнасці прадпрыемстваў, каэфіцыент скарыстання механізмаў, тэхнічныя нормы, нормы выпрацоўкі былі прапрацаваны на мясцах павярхоўна. Гэта-ж факт, што дырэктар буйнейшага торфзавода «Чырвоны сцяг» т. **Хаскін** перад пачаткам работы секцыі пачаў званіць на завод за весткамі. Ні адзін з кіраўнікоў не выступіў на канферэнцыі з канкрэтным аналізам сваёй работы, паказам нявыкарыстаных рэзерваў.

Даволі прывесці такія прыклады, што ў мінулым годзе карысная работа трактараў складала ўсяго 71 проц. На торфзаводзе «Чырвоны сцяг» вытворчая магутнасць машын выкарыстоўвалася на 65—67 проц. Рабочыя кар'ераў фактычна працавалі ў змену 6 гадзін. Астатні-ж час траціўся на перасоўку машын, на тэхнічныя непаладкі і інш. Гэты «вопыт» павінен быў быць улічаны Белторфам пры складанні праектаў новых норм, але канферэнцыя наткнулася на адваротную з'яву.

На асноўнай секцыі, па машына-фармовачнай здабычы торфу, Белторф выступіў са сваім праектам, у якім выведзена для ўсіх заводаў адна — «сярэдняя» норма, і пад гэту «сярэднюю» меркавалася падагнаць усе прадпрыемствы. Прадстаўленыя лічбы новых норм значна заніжаны супроць справаздачных даных дасягнутай прадукцыйнасці рабочымі тарфянікамі ў мінулым сезоне. Напрыклад, на торфзаводзе «Свабода» ў сезоне 1935 года рабочыя ў кар'ерах за час чыстай работы ў сярэднім давалі па 389 торфацаглін. Белторф-жа «спраектаваў» новую норму — у 330 торфацаглін. На торфзаводзе «Дукора» прадукцыйнасць рабочага была 303 торфацаглины, па «праекту» — 290. Такія-ж заніжаныя нормы прадукцыйнасці выпрацаваны Белторфам амаль для ўсіх заводаў.

У рэзультаце дэтальнай прапрацоўкі «праектаў» Белторфа нормы выпрацоўкі секцыямі павышаны на 5,8 проц., па заводах нізавой прамысловасці Наркаммясцпрома на 6 проц. Каэфіцыент карыснай работы трактараў на фрэзернай дабычы павышан на 0,82 проц. Хуткасць трактара за гадзіну складзе да 5,5 кілометра замест 4,5 па праекту.

Ці ўсё ўлічана секцыямі? Безумоўна, што ў тарфяной прамысловасці ёсць яшчэ многа захаваных рэзерваў, якія ў дастатковай ступені не ўскрыты. Пра гэта гаварылі ў сваіх выступленнях стахановцы **Савіцкі, Гарачая, Сеўрук** і інш.

Студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б у сваіх рашэннях адзначыў слабую работу дырэктара трэста Белторфа т. **Кузняцова** па кіраўніцтву стахановскім рухам у тарфяной прамысловасці. Пленум патрабаваў ад усіх работнікаў тарфяной прамысловасці большэвіцкай работы па разгортванню стахановскага руху і падрыхтоўкі да новага сезона.

Гэтыя патрабаванні не былі ўлічаны ў рабоце канферэнцыі. Зусім мала гаварылі тут аб вопыце стахановцаў, аб метадах іх работы. Між тым на радзе заводаў стахановскі рух сустракае вялікае супраціўленне (Асінторф, «Чырвоны сцяг»). Яркім прыкладам можа паслужыць выступленне на канферэнцыі дырэктара торфзавода «Чырвоны сцяг» тав. **Хаскіна**, які заявіў, што на заводзе «ёсць абставіны, якія прымушаюць лімітаваць стахановскі рух». «Лімітамі» ў т. Хаскіна з'яўляюцца простыя дошкі і рэйкі, адсутнасцю якіх ён тлумачыць ігнараванне стахановскага руху. Гэта варожае выступленне не сустрэла на канферэнцыі рэзкага адпору.

На радзе заводаў сабатажнікі ўсялякімі сродкамі стараюцца перашкодзіць стахановцам у іх рабоце. На торфзаводзе «Чырвоны сцяг» стахановцы працавалі ўсю зіму без рукавіц. На заводзе «Радзевічы» стахановская брыгада ГАЛКО, якая выконвае норму на 250—300 проц., ужо тры месяцы не атрымлівае зарплаты. Гэтыя факты з'яўляюцца сур'ёзным сігналам для ўсіх работнікаў тарфяной прамысловасці, асабліва перад пачаткам новага торфсезона.

У 1936 годзе заводы Белторфа павінны даць нашай прамысловасці 550 тысяч тон торфу. Гэта праграма з'яўляецца мінімальнай. Правядзенне ў жыццё пэлага раду рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, намечаных канферэнцыяй, перавод тарфянікаў на прагрэсіўную аплату, новыя распрацаваныя нормы, — усё гэта з'явіцца магутным стымулам для яшчэ больш высокага ўзняцця прадукцыйнасці працы.

І. ТУРЭЦКІ.

Апартуністычная благадушнасць

(Сіроціна. Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»)

У мінулым годзе ў Сіроцінскі раён быў завезен гатунковы ячмень «залаты» на плошчу ў 488 гектараў і пшаніцы на плошчу ў 140 гектараў. Раён меў усё магчымасці з завезенага насення павялічыць гатунковыя пасевы ў гэтым годзе ў 5—6 раз.

Але нават і з гэтай задачай раённае кіраўніцтва не справілася. Гатунковы матэрыял з прычыны дрэннага хавання амаль зусім негодны для пасеўных мэт.

Гатунковая пшаніца ў калгасах «Рэвалюцыйны шлях», «Блабожнік», «Іскра», імя Молатава, «Чырвоная Лоўжа», «Віцебскі пралетарый» з той-жа прычыны аказалася непрыгоднай для сяўбы. Так абстаіць справа з гатунковай пшаніцай і ячменем.

А як з астатнім насеннем?

Вось некалькі лічб. З 6.000 цэнтнераў засыпанага калгасамі насеннага ячменю, па даных контрольнай насеннай лабараторыі, аказалася чыстым, прыгодным для сяўбы ўсяго 1.000. З засыпаных 10.000 цэнтнераў аўса чыстым аказалася каля 2.000. З паўтары тысячы цэнтнераў пшаніцы прыгоднай аказалася толькі 400 цэнтн. З праверанага лабараторыяй 3.500 цэнтн. ільну прыгоднага аказалася 800 цэнтн. Тое-ж самае можна сказаць і аб іншых культурах. Гароху прыгоднага 350 цэнтн., непригоднага 1.500 цэнтн. У 80 калгасах раёна (са 140) сапсаваны насенне. Асобныя культуры (авёс, ячмень, пшаніца, лён) ніжэй кандыцыйнай усхожасці і, як пасеўны матэрыял, непрыгодны. На прыклад, у калгасе «Чырвоная Крупчына», Шумілінскага сельсовета ячмень паказаў 68 проц. усхожасці.

І з такім пасеўным матэрыялам раённыя кіраўнікі лічаць магчымым «хоць зараз пачынаць сяўбу».

У раёне налічваецца зусім дастатковая колькасць зерняачышчальных машын — 28 трыераў і 102 «трыумфы». Але гэтыя машыны не ў пашане ў многіх калгасах Сіроцінскага раёна.

Толькі з прычыны апартуністычнай благадушнасці, антыпартыйных адносін да такой важнейшай справы раён апынуўся перад самым пачаткам пасеўнай кампаніі ў такім пагражаючым становішчы.

Т. ШАРШНЁЎ.

Па ініцыятыве сіроцінскага райсовета Асоавіяхіма ў Шумілінскім сельсавеце арганізавен гурток вашылаўскіх кавалерыстаў.

НА ЗДЫМКУ: ўдзельнікі гуртка на конях (злева направа: Прапецкая Я. І. — старшыня сельсовета, Калеснікава Е. Л. — стахановка калгаса «Чырвоны берэцьбіт», Каштанаў — рахункавод сельсовета.

Фото Шаршнёва.

МАЛЕНЬКІ ФЕЛЬЕТОН

Як комсамолка Ратнікава праўды шукала

Людзі доўга не ведалі, у чым тут справа: чаму гэта загадчык Буда-Кашалеўскага райза так на жанчын прыглядаецца? І не на ўсіх жанчын, а толькі на супрацоўніц свайго аддзела. Асабліва ён чамусьці часта паглядаў на Ірыну Ратнікаву, якая працавала ў яго аддзеле статыстыкам. Ці не закахаўся? — прабавалі здагадвацца некаторыя. Але не верылася, што такі чорствы і бяздушны чалавек здольны на такое чалавечае пачуццё. «Нешта-ж нейкае тут ёсць», — ламалі людзі галаву.

І нарэшце ўсё высветлілася: гэта загадчык райза такім спосабам дзяржаўныя сродкі эканоміць. Высветлілася гэта адразу, як толькі загадчык райза пераканаўся, што Ратнікава сапраўды такі збіраецца стаць маткай. Не паспела тут тав. Ратнікава заявіць аб тым, што ёй патрэбен дэкрэтыўны адпачынак, як загадчык райза сам «пайшоў ёй насустрач» і заявіў, што ён зняў яе з працы, бо ў яго няма лішніх грошай, каб плаціць Ратнікавай невядома за што. Ратнікава, вядома, абурылася. Але яна ведала, што на яе баку совецкія законы і клопаты комуністычнай партыі, што за яе заступіцца совецкая грамадскасць, якая такой любасцю і ласкай акружае мацярынства. Адным словам, тав. Ратнікава была ўпэўнена, што досыць ёй заявіць голасна аб сваёй крыўдзе, як зараз-жа яна атрымае законны адпачынак, а бюракрат будзе пакараны і яна звярнулася ў газету «Чырвоная змена» з просьбай дапамагчы ёй. Вось тут і пачалася тая самая «дапамога», ад якой няшчасная жанчына зусім без сіл засталася. «Чырвоная змена» накіравала яе скаргу пракурору Буда-Кашалеўскага раёна. А пракурору, думаецца, хочацца займацца гэтай справай і дзеля нейкай комсамолкі псаваць добрыя адносіны з загадчыкам райза? Ён проста спіхнуў гэту справу са сваёй галавы, накіраваўшы яе ў райком комсамола: яна комсамолка, няхай комсамол і абараняе.

Пасля таго, як «дапамога» пракурора скончылася, пачалася «дапамога» райкома комсамола. Сакратар райкома комсамола пайшоў з Ратнікавай да загадчыка райза, але таго не было дома. Прыйшлося Ратнікавай прыйсці другі раз. Але к гэтаму часу сакратара райкома комсамола знялі з працы. Прыйшлося Ратнікавай прыйсці трэці раз. Пайшла яна да загадчыка райза ўжо з намеснікам сакратара райкома комсамола. Загадчык райза катэгарычна адмовіўся задаволіць патрабаванні Ратнікавай. На гэтым «дапамога» райкома комсамола і скончылася. Вышаўшы з кабінета загадчыка райза, намеснік сакратара райкома комсамола так і сказаў: «Ну, што-ж, мы цяпер не можам нічога зрабіць». У яго, такім чынам, хапіла пораху толькі на тое, каб выслухаць грубае і пынічнае адмаўленне загадчыка райза.

Цяпер Ірына Ратнікава пачала хадзіць за дапамогай зноў да пракурора. Але яе справа ўсё яшчэ ніяк не можа вярнуцца з райкома комсамола. І ў мяцеліцу, і ў мароз, і па мокраму снегу ходзіць цяжарная жанчына за дванаццаць кілометраў у раённы цэнтр з калгаса імя Калініна. Пабывала яна ў раёне каля дзесяці раз, прайшла больш за 200 кілометраў, а да праўды ўсё-ж такі не дайшла. Бяздушныя бюракраты толькі глядзяць ды дзівяцца з яе ўпартасці. Няўжо-ж такі яна не зморыцца ды не адчэпіцца нарэшце? А загадчык райза, адчуваючы сваю беспакаранасць, нахабна заявіў Ратнікавай проста ў вочы: «Ты думаеш, што ты ўмееш пісаць у «Чырвоную змену», дык я табе і аплачу адпачынак? Не, я комуніст, і больш законаў ведаю, чым ты».

Памыляецеся, шаноўны бюракрат. Колькі-б законаў вы ні ведалі, вы забываецеся на адзін з асноўных совецкіх законаў, які абараняе правы жанчыны-маткі і жорстка карае кожнага, хто гэтыя правы адважыцца ігнараваць.

К. КРАПІВА.

МУЗЫЧНАЯ ШКОЛА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ СТАХАНАЎЦАЎ

Гэтымі днямі ў клубе металістаў у Менску адкрылася музычная школа для дзяцей рабочых-стахановцаў машынабудаўнічых заводаў імя Варашылава і імя Кірава. Арганізаваны класы скрыпкі і раяля. У бліжэйшы час адкрываецца музычная школа для рабочых-стахановцаў без адрыву ад вытворчасці на 30 чал.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

НОВЫЯ ДАНЫЯ АБ КАТАВАННЯХ СОВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН У ЯПОНА-МАНЧЖУРСКІХ ТУРМАХ

У ЯПОНСКАЙ ЖАНДАРМЕРЫІ ЗАМУЧАН НА СМЕРЦЬ СОВЕЦКІ ГРАМАДЗЯНІН БАГАМОЛАЎ

ХАБАРАЎСК, 20 сакавіка. (БЕЛТА). Тут атрыманы новыя весткі аб праследваннях совецкіх грамадзян у Манчжурыі і створаным там японцамі рэжыме беззаконня і свавольства.

У кастрычніку 1935 года па фальшываму даносу белагвардзейца-паліцэйскага Снепанава японскай жандармерыяй на ст. Мяньдухе быў арыштаван мясцовы жыхар, совецкі грамадзянін **Багамолаў**, які быў перавезен у Стары Харбін, дзе падвяргаўся катаванням і здзекам з боку японскіх жандараў і рускіх белых і быў імі забіт.

Каб замесці сляды тэтага зверскага забойства, японская жандармерыя прыдумала версію аб тым, што Багамолаў нібыта ўцёк у часе допыту з жандарскага аддзялення на ст. Якешы. Гэта версія была паведамлена генеральнаму консульству СССР ў Харбіне і совецкаму консулу на ст. Манчжурыя ў адказ на патрабаванне апошніх аб вызваленні Багамолава. Адначасова японскія жандары прынялі меры да таго, каб весткі аб забойстве Багамолава не прасачыліся на свет праз іншых арыштаваных, сядзеўшых разам з Багамолавым і ведаўшых аб спаткаўшым яго лёсе.

Аднак, не гледзячы на ўсе гэтыя меры, атрыманы дакладныя паказанні сведак, якія ўстанаўляюць карціну забойства Багамолава і здзекаў і катаванняў іншых арыштаваных совецкіх грамадзян.

Згодна наведаных намі даведак, паўпрэд СССР у Японіі ашчэ 21 студзеня г. г. заявіў японскаму ўраду пратэст супроць незаконных арыштаў і катаванняў совецкіх грамадзян японскімі жандарамі і, у прыватнасці, патрабаваў дэталёвага расследвання справы Багамолава і паведамлення яму аб сапраўдным яго лёсе і месцазнаходжанні. Адказу на гэты пратэст да гэтага часу не атрымана.

НІЯКАЙ АМНІСТЫІ КАТУ-ГЕНЕРАЛУ

ПАРЫЖ, 20 сакавіка (БЕЛТА). Як паведамляюць з Мадрыда, вярхоўны суд Іспаніі адмовіўся прымяніць амністыю да генерала Очоа, які абвінавачваецца ў расстрэле без суда многіх удзельнікаў забастоўкі ў Астурыі ў кастрычніку 1934 года.

У рашэнні суда ўказваецца, што амністыя прымяняецца да палітычных зняволеных, у той час як злачынствы Очоа «не могуць быць вытлумачаны ні палітычнымі, ні сацыяльнымі матывамі».

ГЕРОЙ СОВЕЦКАГА САЮЗА ТАВ. ЛЕВАНЕЎСКІ Ў ЗША

ВАШЫНГТОН, 17 сакавіка (БЕЛТА). Ваенны міністр Дэрн і начальнік генеральнага штаба Крэйг прынялі героя Совецкага Саюза Леваневскага ў памяшканні ваеннага міністэрства. Паўпрэд СССР у ЗША Траяноўскі прадставіў ім Леваневскага, які знаходзіцца ў ЗША на працягу двух месяцаў і вывучае самалёты, маторы і снаражэнне для арктычных пералётаў.

ДЫСПУТ АБ ФАРМАЛІЗМЕ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

20 сакавіка ў Доме пісьменніка пачаўся дыспут аб фармалізме ў беларускай літаратуры. З дакладам выступіў прафесар Я. Бранштэйн. Першымі ў спрэчках выступілі пісьменнікі М. Лынькоў, П. Глебка, кампазітар І. Любан.

Даклад прафесара Бранштэйна, а таксама выступленне Любана яскрава паказалі, што творчая дыскусія ў Доме пісьменніка не стала ліцца на належнай прынцыповай вышыні. Тав. Бранштэйн выключна гаварыў пра творчасць маладых пісьменнікаў і абсалютна абышоў творчасць старэйшага пакалення. Таксама не ўскрыў крытычных работ, якія адстойвалі і адстойваюць прынцыпы фармалізма (Кучар, Плэшчынскі і інш.). У заўвагах Любана гучэлі ноткі абываталькага падыходу да некаторых твораў совецкай паэзіі.

Трэба чакаць, што далейшы ход дыспуту больш канкрэтна, больш рашуча ўскрые недахопы беларускай совецкай літаратуры.

СХОД БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ

Гэтымі днямі адбыўся сход секцыі совецкіх кампазітараў, прысвечаны абмеркаванню артыкула **«Звязды» — «Аб фармалізме, прыстасаванстве і боязні самакрытыкі»**.

Сход прызнаў, што ўказанне «Звязды» адносна групаўшчыны, замкнутасці, слабога разгортвання большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі ў секцыі кампазітараў — правільнае, што секцыя зусім не зрабіла для сябе вывадаў з артыкулаў **«Праўды»** — «Сумбур вместо музыки» і «Балетная фальш».

Пасля выступлення раду таварышоў быў зацверджан план далейшай работы. Гэтымі днямі адбудзецца рад вечароў, прысвечаных абмеркаванню творчасці кампазітараў Туранкова, Аладава, Залатарова, Чуркіна і інш.

СТАХАНАЎСКАЯ ДЭКАДА НА ТРАНСПАРЦЕ

З вялікім уздымам праходзіць усесаюзная стаханаўская дэкада па гомельскаму аддзяленню эксплаатацыі. Асноўныя паказальнікі ўсе дні перавыконваюцца. 19 сакавіка план пагрузкі выкананы на 107,7 проц. Павялічана ўчастковая хуткасць паяздоў. Зніжан прастой вагонаў. Лепш за ўсіх працавала змена дыспетчара **Ладырда**. Раней адставаўшая змена дыспетчара **Лапіцкага** зараз выйшла ў рады перадавых. Саставіцель гэтай змены **Гурчанаў** сфармаваў і расфармаў поезд за 26 мінут пры заданні 47. Саставіцель **Скрыпко** сфармаваў поезд за 30 мінут пры заданні 45. Па гэтай змене ёсць значнае зніжэнне прастояў вагонаў.

На станцыях Гомель, Новабеліца і Гародня па ініцыятыве партарганізацыі створаны брыгады хатніх гаспадынь па праверцы пільнасці стралачнікаў і сігналістаў, па прывядзенню ва ўзорнае становішча службовых памяшканняў, лепшаму абслугоўванню пасажыраў і інш.

Тэрытарыяльныя арганізацыі аказваюць дапамогу чыгунцы. Камбінат «Спартак» вылучыў спецыяльных работнікаў у дапамогу станцыі Гомель. Для гэтай-жа мэты на станцыі Новабеліца кожны дзень дзяжурыць член райсавета.

Начальнік гомельскага аддзялення эксплаатацыі **Фокін**.

Начальнік палітаддзела **Зіноўеў**.

Старшыня лінкома **Голад**.

ФАБЗАВУЧЫ БССР

Штогодна 13 фабзавучаў сістэмы Наркамлясдпрома БССР выпускаюць сотні кваліфікаваных рабочых. У 1935 годзе фабзавучы скончыла звыш 1.200 чалавек: швейнікаў — 390, металістаў — 314, тарфянікаў — 104, будаўнікоў — 101 чал. і т. д.

На 1936 год у фабзавучы прынята 1990 чалавек. Будуць выпушчаны 1.428 кваліфікаваных рабочых, з іх звыш 400 металістаў, 177 будаўнікоў, 120 паліграфістаў, 90 абутнікаў і т. д.

СПЛАЎ ЛЕСУ ЗАГРАНЦУ

«Экспартлес» падпісаў кантракт з англійскай лесапрамысловай фірмай на продаж і дастаўку сплавам з БССР па Заходняй Дзвіне на Рыгу буйнай партыі сліпероў (падвоенных шпал). Для прыёмкі лесу ў БССР прыбылі з Англіі прадстаўнікі фірмы. З латвійскай фірмай заключаны кантракт на сплаў у Рыгу вялікай партыі бярвенняў.

Беларуская кантора «Экспартлеса» датэрмінова заканчвае адгрузку бярвенняў праз станцыю Бігосава для Клайпедскага лясного сіндыката (Літва).

ОДРЫ МАСОН ПРАЕХАЛА ПРАЗ МЕНСК

21 сакавіка хуткім поездам з Масквы праз Менск праехала ў Англію «пасланніца міра і дружбы» англійская піонерка Одры Масон — 15-гадовая школьніца, дачка пазнаёмага кандуктара. На вакзале ў Менску Одры Масон сустракалі піонеры і школьнікі сталіцы, а таксама чыгуначнікі. Піонерка 39 школы Грышкова прыпаднесла Одры Масон чырвоны шаўковы гальштук. Менскія піонеры перадалі шчырае прывітанне піонерам Англіі. (БЕЛТА).

Новыя сельскагаспадарчыя машыны

Выпушчаны першыя экземпляры новых сельскагаспадарчых машын, сканструяваных работнікамі Беларускай вопытнай сельскагаспадарчай станцыі ў Менску, Рязанскі сельмашзавод зрабіў першую двухрадковую бульбаўборачную машыну, сканструяваную дырэктарам станцыі тов. Мацэпура. Машына ўбірае 4 гектары бульбы за рабочы дзень. Калгасы і саўгасы Саюза ў бягучым годзе атрымаюць 4.000 такіх машын.

Машынабудаўнічы завод у Барысаве выпусціў першыя экземпляры корнерэзак сістэмы работнікаў станцыі тт. Мазурко і Дзяканенка. Для БССР ў бягучым годзе выпускаецца 500 корнерэзак. Прадукцыйнасць кожнай з іх — ад 3 да 5 тон каранеплодаў у гадзіну. Завод і Варашылава ў Менску прыступіў да вырабу канавакапацеляў, таксама сканструяваных станцыяй. Кожны канавакапацель за 10 гадзін работы выкапвае канаву працяжнасцю ў 10 кілометраў. Машынабудаўнічы завод у Віцебску наладжвае выраб балотных плугоў новай сістэмы Фомічава.

2 МІЛЬЁНЫ ВЕДРАЎ ВАДЫ Ў СУТКІ

Беддзяржпраектам распрацаваны тахнічны праект пабудовы ў Менску ў даліне ракі Лошыца новай водаправодная станцыі. Будаўніцтва яе пачнецца гэтымі днямі. Кошт работ — паўтара мільёна рублёў. Адначасова пашыраецца Навінская водаправодная станцыя. Запраектавана таксама рэканструкцыя гарадской водаправоднай сеткі, шляхам кальцавання яе. Агульны кошт асігнаванняў па работах, звязаных з будаўніцтвам новай водаправоднай станцыі і рэканструкцыяй існуючага водаправода, у бягучым годзе вызначаецца ў 4,5 мільёна руб.

Да студзеня 1937 г. падача вады гарадскім водаправодам павялічыцца да двух мільёнаў вёдраў у суткі. На кожнага жыхара прыдзецца 70-75 літраў вады ў суткі замест цяперашніх 25 літраў.

АБЯЗБОЛЬВАННЕ РОДАЎ У КАЧЭРЫЦКАЙ БОЛЬНІЦЫ

Качэрыцкая больніца (Кіраўскі раён) правяла два вопыты абязбольвання родаў. Калгасніцы Міхалаі Мар'я і Цэдзік Фядора раджалі без болю.

— Раджаю я другі раз, — расказвае Цэдзік. — Першы раз нарадзіла дзіцё дома. Колькі было тады гора і болю. Зараз я ніякага болю не адчувала. Як добра было раджаць!

М. ЯРЧАК.

ГРЫМІРАВАЛЬНЫЯ ПРЫЛАДЫ ДЛЯ КАЛГАСНЫХ ДРАМГУРТКОЎ

Для калгасных тэатраў і драматычных гурткоў БАКТ Белкаапсаюза закупіў на 14 тысяч рублёў розных грымівальных прыладаў, як нарыкі, грым і інш. Грымівальныя прылады рассылаюцца ў раённыя і сельскія магазіны на гандлю культтаварамі. У бліжэйшы час будзе закуплена новая партыя грымівальных прыладаў.

НОВЫЯ ПРАВІЛЫ ГАНДЛЮ МЯСАМ

Згодна новых правіл гандлю мясам кожны гатунак мяса павінен ляжаць у краме на асобнай паліцы з абазначэннем цаны і гатунку. Пакупнік мае права праверыць якасць мяса па цане, гатунковасці і ўпітанасці. У кожным магазіне будуць вывешаны правілы вызначэння мяса па гатунках. Па жаданню пакупнікоў прадаўцы магазіна абавязаны пераапрацаваць мяса ў фарш.

БЫЯЗНОЕ ПАСЯДЖЭННЕ ПРЭЗІДЫУМА ЦК МОПР БССР

Сёння ў дзяржынскім пардоме (г. Дзяржынск) адбудзецца выязное пасяджэнне прэзідыума Цэнтральнага Камітэта МОПР БССР. У работах прэзідыума прымуць удзел прыехаўшыя прадстаўнікі замежных секцый МОПР тт. Божаны (Венгрыя), Джонс (ЗША) і Розен (Лацінская Амерыка). На прэзідыуме будзе заслухана справаздача старшыні райкома МОПР тав. Апраніча і суддакляды ячэек МОПР калгаса «Ленінскі шлях», саўгаса «Новасёлкі», пагранатрада і іншых аб сваёй рабоце.

Я. ЭЛЬКІНД.

КАВАЛЕРЫЙСКІЯ ГУРТКІ Ў СОЎГАСАХ

У свінагадоўчым саўгасе «Ялова», Чавускага раёна, арганізаваны кавалерыйскі гурток. Конна-спартыўнай справе навучаецца 6 жанчын і 6 мужчын. Беларускі рэспубліканскі камітэт профсаюза свінагадоўчых саўгасаў намеціў арганізаваць кавалерыйскія гурткі ў 15 саўгасах.

Коратка

(Ад карэспандэнтаў «Звязды»).

* **Новая культурная лазня** пабудавана ў калгасе «Асвета», Клічаўскага раёна.

* **Двухтыднёвыя курсы для старшынь бюро вытворчых калектываў фізкультуры** адкрываюцца ў 18 гарадах рэспублікі. На курсах будуць займацца з адрывам ад вытворчасці 300 чал.

* **На 100,3 проц.** выканаў на 15 сакавіка Менскі раён план мабілізацыі сродкаў I квартала.

ЗДАРЭННІ

* **Нашчасны выпадак.** Рабочы рэчыцкага завода імя Томскага А. Ф. Бабчонак, жадаючы сесці на манеўруючы на ст. Рэчыца паравоз, абарваўся і папаў пад колы. Бабчонак, якому адрэзала кісці абодвух рук, дастаўлен у больніцу.

* **Злачынца за рулём.** Дырэктар саўгаса Горкі-Абчак І. П. Цецярук, не маючы праў на кіраванне аўтамашынай, ехаў на легковой машыне з Мейска па магілёўскай шашы. Развіўшы вялікую хуткасць, ён, не даючы сігналаў, пачаў абганяць падводу. Уперадзе падводы ішоў чырвонаармеец Н. С. Мерынаў, на якога і наскочыла машына, кіруемая Цецярукам. Мерынаў атрымаў раненні. Цецярук прыцягваецца да суловай адказнасці.

Каўроўскі экскаватарны завод выпусціў новы экскаватар «ПДГ» (поўнапаваротны, рухавы, гусенічны). У адрозненне ад экскаватара тыпу «ППГ» новы экскаватар мае замест грамоздкага парэвога рухавіка рухавік аўтамабільнага тыпу. Ёмкасць каўша экскаватара — 0,56 кубометраў. Ён можа працаваць 7 рознымі дэталямі: прамой лапатай рыць у забоі, кранам падымаць грузы, грэйферам перагражваць сыпучае, копрам забіваць сваі і т. д. Папярэднія выпрабаванні паказалі добрую якасць новага экскаватара. У бягучым годзе завод выпусціць 130 такіх экскаватараў.

На здымку: новы экскаватар «ПДГ».

Фото Бутракова (Саюзфото).

СПАРТЫЎНАЯ ХРОНІКА

* На ўсесаюзныя спаборніцтвы па штанге выехала ўчора ў Ленінград каманда штангістаў БССР. У складзе каманды тт. Лапідус, Башкіраў, Масаловіч, Мілеєў, Наумаў, Чарнаушка, Тайц, Грыгаровіч і Бланштэйн. Спаборніцтвы ў Ленінградзе пачнуцца 24 сакавіка.

* 12 красавіка ў Менску адбудуцца ўсесаюзныя спаборніцтвы па французскай барацьбе саюза будаўнікоў. Чакаецца прыезд каманд Масквы, Ленінграда, Закаўказя, Кіева, Казані і інш.

ПАВЕДАМЛЕННІ

22 сакавіка 1936 года, у 6 гадзін вечара, у партабінеце Дома партактыва (пакой 21) адбудзецца групавая кансультацыя тав. Меерович для прапагандыстаў па гісторыі ВКП(б) на тэму: «Партыя ў перыяд рэакцыі і новага рэвалюцыйнага ўздыму».

22 сакавіка 1936 г., у 7 гадз. вечара, у малой зале Дома партактыва Менгаркома КП(б)Б, адбудзецца групавая кансультацыя тав. Саевіча на тэму: «Вучэнне Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна аб дыктатуры пролетарыята» для прапагандыстаў і актатараў.

Дом партактыва Менгаркома КП(б)Б.

22 сакавіка 1936 года, ў памяшканні клуба імя VII з'езда профсаюзаў адбудзецца даклад тав. Пасса аб міжнародным становішчы для актыва Варашылаўскага горрайкома. Пачатак у 6 гадзін вечара.

Варашылаўскі горрайком КП(б)Б.

ПАРТКОМАМ, ПАРТОРГАМ І ПРАПАГАНДЫСТАМ СТАЛІНСКАГА РАЁНА

Чарговы дзень парткомсамольскай вучобы і партдзень прысвяціць прапрацоўцы пастаноў III пленума КПК пры ЦК ВКП(б) і перадавых «Праўды» ад 17 і 18 сакавіка.

Сталінскі горрайком КП(б)Б.

Кагановіцкі райком КП(б)Б просіць з'явіцца ў райком у 8 пакой тт. Мартынаву Юлію Нікалаеўну і Кравеца Майсея Аронавіча — 22 сакавіка у 7 гадзін вечара.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ПК КПК

Парткалегія КПК пры ЦК ВКП(б) па Беларусі паведамляе, што 28 сакавіка 1936 г. у 10 г. раніцы, у гор. Менску (памяшканне ЦК КП(б)Б, 2 паверх, пакой № 32) парткалегіяй КПК па БССР будуць разглядацца апеляцыйныя партсправы наступных таварышоў:

Аламіева К. М., Матлакова А. Я. — Церахаўка; Жычко А. А. — Даманавічы; Шульжэнка Г. А. — Нароўля; Кашчарыкава А. В. — Рэчыца; Петрука Д. Ф. — Жыткавічы, Стасевіча Е. А. — Копыль, Літвінава Г. П., Юркевіча В. М. — Круглянскі раён; Прудзікава І. Ф. — Карма; Акулова А. І. — Будакашалёва; Німашэнка Ф. А. — Рэчыцкі раён; Ободава М. А. — Чавускі раён; Баршчэўскага — Дрыбінскі раён; Берынай Б. І. — Крычаў, Лібермана З. — Мазыр, Ігрэбенчыка Я. І. — Каспяковічы; Савіцкага Л. Н. — Жыткавічы; Афанасенкава Ф. М. — Свяцілавічы; Жаўнеровіча Я. П. — Чырвоная Слабада; Маркавец П. Я. — Петрыкаў; Франкеля І. К., — Мозыр; Іванчыкава Г. Е. — Петрыкаў; Медведзікава Л. Т. — Хоцімск; Бабінава С. І. — Журавічы; Рогач І. Ф. — Віцебск; Мелехава К. І. — Расоны; Леўчак З. Д. — Мехава; Шаўлава П. І. — Сураж; Зельманова Б. М. — Полацк; Казакова Д. М. — Чэрыкаў; Батурэ Н. В. — Парычы, Саколік — Н. Ц. — Гарадок.

Яўка вышэйпералічаных таварышоў абавязкова. Прычым апошнія павінны прадставіць водапісы аб первічнай партарганізацыі аб сваёй апошняй рабоце.

Парткалегія КПК па БССР.

***

Парткалегія КПК па Беларусі просіць тт. Брылёва Аляксея Грыгор'евіча, Махора Кузьму Леонавіча, Песіна Еселя Элькава і Афанасенка Афанасія Лукіча з'явіцца 29 сакавіка г. г. у 11 гадзін раніцы ў Гомельскі ГК КП(б)Б на разбор іх апеляцыйных партспраў.

Парткалегія КПК па БССР.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

Першы Беларускі дзяржаўны тэатр БДТ-1

22 сакавіка

ЯК ЯЕ ЗАВУЦЬ

Пачатак у 8 г. веч.

Білеты — у касе тэатра.

Гукавы кінотэатр „ПРОЛЕТАРЫЙ"

Новы гукавы мастацкі фільм

АПОШНІ ТАБАР

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»

Гукавы мастацкі фільм

ГІБЕЛЬ СЕНСАЦЫІ

Кінотэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".

Сёння, 22 сакавіка,

ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ПАСТАНОЎКІ

вялікага гукавога мастацкага фільму

„МЫ З КРАНШТАТА"

Штодзенна 4 сеансы. Пачатак у 5.45, 7.30, 9.15 і 11 гадзін.
Каса адкрыта з 1 гадз. дня.
Спазніўшыяся на іншасэнс не дапускаюцца.
Білеты для калектываў па заяўках адпускаюцца без чаргі.

Кіно „СПАРТАК".

Ад 22 сакавіка

выдатны мастацкі фільм

ПА ТОЙ БОК

Драма ў 7 частках.
У праграме кінохроніка.
Штодзенна 4 сеансы.
Каса — з 4 гадзін.

Навуковаму работніку

ПАТРЭБНА КВАТЭРА

з усімі выгодамі, 25-40 кв. м.
Прапановы адрасаваць: Менск, Галоўны паштамт, да запатрабавання праф. Касіякову.

Калектыў работнікаў Галоўліта БССР выказвае глыбокае спачуванне тав. Калентэ М. М. з прычыны пасцігшага яго горя — смерці сына

ЛЁШЫ.

Аб'явы прымаюцца да 1 дня

УВАГА! УВАГА!

НАСЕННЕ

траў, кораньплодаў і гародніх культур да веснавой пасеўнай кампаніі

прадаецца з ларкоў, складаў і баз ДЗЯРЖСОРТФОНДА ў Менску, Рудзенску, Пухавічах, Бабруйску, Слуцку, Будакашалеве, Рагачове, Перахоўцы, Ветцы, Хойніках, Талочыне, Бялынічах, Оршы, Віцебску і Полацку.

ПА МЕНСКУ ЛАРКІ АДКРЫТЫ:

1) На крытым рынку (б. Віленскі) ларок № 16.
2) На Чэрвеньскім рынку.
3) На плошчы 25 Кастрычніка (б. Юбілейная).

Ва ўсіх іншых раёнах насенне прадаецца са складаў райзагаў і Заготзярно.

Продаж праводзіцца ўсім.

Белкантора Дзяржсортфонда.

ДА ЎВАГІ калгасаў, калгаснікаў і ўсіх працоўных!

СТРАХУЙЦЕ СВАЮ МАЕМАСЦЬ ПА ДОБРААХВОТНАМУ СТРАХАВАННЮ НА ВЫПАДАК СТЫХІЙНЫХ НЯШЧАСЦЯЎ І ЗДАРЭННЯЎ!

Калгасы могуць страхаваць

у добраахвотным парадку, звыш абавязковага акладнога страхавання, да поўнага кошту — будынкі, прадпрыемствы з абсталяваннем, інвентар, коней, буйную рагатую жывёлу, свіней і авечак.

У добраахвотным парадку можна страхаваць трусоў — матак, племянную птушку і пчол (вуллі).

Калгаснікі, працоўныя аднаасобнікі і іншыя працоўныя могуць страхаваць у добраахвотным парадку буйную рагатую жывёлу, коней (у гаспадарках аднаасобнікаў), свіней, авечак, коз, хатнюю маемасць, сельскагаспадарчыя прадукты.

Па добраахвотнаму страхаванню жывёлы і будынкаў дазвол растэрміноўка страхавых плацяжоў на два тэрміны — палова плацяжоў уносіцца пры заключэнні страхавання, а другая палова праз два месяцы.

Заяўляйце аб жаданні страхаваць сваю маемасць страхавой інспекцыі фінадзела або ў сельсавет.

Кіраўніцтва дзяржстраха НКФ БССР.

ЦСПСБ і Беларускі совет НІТО

склікаюць 25—26 сакавіка ў памяшканні Цэнтральнага дома тэхнікі (Комсамольская, 25)

МЕНСКУЮ ГАРАДСКУЮ КАНФЕРЭНЦЫЮ

па эксплаатацыі вентыляцыйных установак.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Задачы па асвоєнню вентыляцыйнай гаспадаркі ў сувязі са стаханаўскім рухам. (Даклад т. Гурэвіча — Ленінградскае НІТО вентыляцыі і асвятлення).
2. Становішча вентыляцыйнай гаспадаркі ў прамысловасці БССР (Даклад інстытута працы ВЦСПС).

На канферэнцыю запрашаюцца дырэктары і тэхнічныя дырэктары прадпрыемстваў, старшыні фабзаўмясцкомаў, грамадскія інспектары працы, механікі, работнікі па догляду вентыляцыйных установак і работнікі ЦП саюзаў.

Пачатак у 7 гадзін вечара.

Уваход па разасланых білетах.

ЦСПСБ, Бел. совет НІТО.

УСІМ АКРУГОВЫМ, РАЁННЫМ, ГАРАДСКІМ АДДЗЕЛАМ НАРОДНАЙ АСВЕТЫ

ВЕСНАВЫЯ КАНІКУЛЫ

ў гарадскіх школах правесці з 26 сакавіка па 31 сакавіка включна.

У вясковых школах веснавыя канікулы правесці ў перыяд з 24 сакавіка да 15 красавіка г. г. працяжнасцю ў 6 дзён. Тэрміны для кожнага раёна ўстанаўляюцца пастановаю прэзідыума РВК.

Аб часе веснавых канікул раёна абавязаны паведаміць НК Асветы.

Нам. наркома асветы БССР ГЕРШОН.

Аб'ява аб рэгістрацыі

Народны камісарыят фінансаў БССР

паведамляе, што на падставе пастановы СНК БССР ад 26 лютага 1936 года, арганізавана

„ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫ ТРЭСТ СОЎГАСАЎ НКЗЬ"

Згодна палажэння СНК БССР ад 9 лютага 1931 г., аб дзяржаўнай рэгістрацыі прадпрыемстваў, 13 сакавіка 1936 года Наркамфінам БССР праведзена рэгістрацыя «Жывёлагадоўчага трэста соўгасаў НКЗЬ» па рэестру № 60.

Рахунак у Белканторы Дзяржбанка № 75066.

Адрас: Совецкая, 70.

Народны Камісарыят Фінансаў БССР.

У аддзел аб'яў званіце па тэл. 21-845

Аб'ява аб рэгістрацыі

Народны камісарыят фінансаў БССР

паведамляе, што на падставе пастановы НКУГ СССР ад 8 лютага 1936 года,

арганізавана

Беларуская база „СОЮЗОПТМЕТИЗ"

(усесаюзная дзяржаўная кантора па аптоваму гандлю металёвымі вырабамі, сілікатнымі таварамі, мэбляй і шчэпнымі таварамі).

Згодна палажэння СНК БССР ад 9 лютага 1931 г. аб дзяржаўнай рэгістрацыі прадпрыемстваў, 10 сакавіка 1936 года Наркамфінам БССР праведзена рэгістрацыя «Союзоптметиз» па рэестру № 61.

Адрас: г. Менск, Совецкая, № 70.

Народны камісарыят фінансаў БССР.

Зубленыя і украдзеныя дакументы лічыць несапраўднымі:

ГАТАЎ Н. С. — даведка аб рабоце ў калегіі абаронцаў, РЭВЗІН Л. Л. — пашпарт, КОЛПАК В. М. — віза, ДУНЕЦ У. Д. — пашпарт, РУСАКОВІЧ С. М. — пашпарт і студэнцкае пасведчанне, ЮРАСЕЎ Ц. А. — ганаровая грамата за № 144, выданая прэзідыумам ЦВК СССР аб узнагародзе яго орденам «Знак почета», ЗУБЧОНАК П. П. — метрычны выпіс, САННІКАЎ Н. Д. — профбілет, ЛАТУШКА С. Р. — профбілет і комсамольскі білет, МАРШАК А. І. — вайсковы білет; ГОДЭР Г. Ф. — профбілет, СКВАРКОЎСКІ Е. А. — студэнцкае пасведчанне, ТАЛЕСНІКАВА І. М. — пенсійная кніжка, ПУШ В. П. — профбілет, ЛАШДУС Х. М. — пашпарт, ДАРАГУН І. К. — пашпарт, ЛІЧКО А. Т. — пашпарт, ТАМАШЭВІЧ Ф. А. — профбілет і вайсковы білет, ЛЕГЕНЧАНКА А. П. — пашпарт; ШАЛІМО В. М. — пашпарт, ТАСМАН А. Д. — профбілет.

Тыраж 95055 экз. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. Уп. Галоўлітбела № К—67.